Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ВЕРАСЕНЬ 21 1932 г. № 212 (4464)

Год выданьня XV!

Учора адкрылася ўсебеларуская культпрапнарада

20 верасня [illegible] у памяшканьні Дому [illegible] пенінскага выхаваньня ў КП(б)Б. Камсамольцы [illegible] адкрылася ўсебеларуская культ прапнарада.

Нараду [illegible] культпроп ЦК КП(б)Б тав. ЧАРНУШЭВІЧ. Сваю ўступную прамову Чарнушэвіч прысьвяціў задачам марксыцка-ленінскага выхаваньня ў КП(б)Б.

У парадку дня нарады стаяць тры пытаньні: 1) Аб перабудове партыйна-выхаваўчай работы арганізацый на аснове пастаноў піленскага пленуму ЦК КП(б)Б. 2) Даклады сакратароў РК Пятрыкова, Барысава і Асьвеі аб рэалізацыі пастаноў піленьскага пленуму ЦК па партмасавай і выхаваўчай рабоце і 3) Аб асеньня-зімовай партвучобе.

На вячэрнім пасяджэньні з дакладам па першым пытаньні выступіў нам. загадчыка культпропу ЦК КП(б)Б тав. ЗАЛАТУХІН.

Узьняць тэмпы і якасьць работы лёгкай прамысловасьці

«БССР рабіцца краінай разьвітай прамысловасьці, ператвараючыся з раёну спажываючага ў раён разьвітай сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. БССР першая з Саюзных рэспублік увяла ўсеагульнае пачатковае навучаньне» (рэзалюцыя XIV зьезду КП(б)Б).

Пушчана ў ход за апошнія гады рад буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў (Магілеўская ф-ка штучнага шоўку, Віцебская панчошна-трыкатажная, швэйная і інш.). Пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва з гонарам выконваецца ў чатыры гады.

Як вынік гэтага культурна-гаспадарчага ўзросту, значна паляпшаюцца матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочае клясы і ўсіх працоўных мас Савецкай Беларусі.

Партыя і ўрад перад лёгкай прамысловасьцю, якая непасрэдна задавальняе матар'яльныя патрэбы шырокіх мас, паставілі рад актуальнейшых задач: павялічэньне выпуску прадукцыі, паляпшэньне якасьці яе, мабілізацыя сыр'цовых рэсурсаў і г. д.

Разьвіцьцё буйнай прамысловасьці, якая дае сродкі вытворчасьці, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, якая снабжае сыр'цом лёгкую прамысловасьць,—даюць ёй поўную магчымасьць забясьпечыць у сваёй працы належныя тэмпы. Выконваючы пастанову партыі і ўраду, лёгкая прамысловасьць БССР дабілася ў гэтым годзе значных посьпехаў. Выпуск валавой прадукцыі за 1-е паўгодзьдзе 1932 г. павялічыўся на 32 проц. супроць адпаведнага перыяду мінулага году. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла на 13 проц.

Але гэтыя дасягненьні ні ў якім разе ня могуць быць прызнаны здавальняючымі. Ня гледзячы на выкананьне і перавыкананьне сваіх плянаў паасобнымі прадпрыемствамі, якія забясьпечылі сапраўды бальшавіцкія мэтады работы (зав. «Бальшавік», галянтарэйная, фанэрная галіны вытворчасьці), **уся лёгкая прамысловасьць на сёнешні дзень ідзе па выкананьні гадавога пляну са значнымі прарывамі.** Выпуск валавай прадукцыі за 8 месяцаў г. г. выканан толькі на **86,5 проц., або 50,3 проц.** гадавога пляну. **Гэта азначае, што лёгкая прамысловасьць не дадала краіне прадметаў шырокага спажываньня на мільёны рублёў.**

Пачатак другога паўгодзьдзя, асабліва трэці квартал, ускладае адказнейшыя задачы па лёгкую прамысловасьць. Разгортваньне важнейшых сельска-гаспадарчых кампаній у гэты час патрабуе ад лёгкай прамысловасьці зрабіць шпаркія крокі наперад, вярнуць краіне запазычанасьць за мінулы час.

Аднак, папярэднія вынікі выканаьня пляну паказваюць, што **лёгкая прамысловасьць БССР сваіх задач ня выконвае.** Тэмпы нарастаньня выкананьня прамфінпляну яўна нездавальняючыя. Так, за ліпень месяц па Наркамлёгпраму плян па выпуску прадукцыі выканан на **83,9 проц.** і за жнівень—на **86 проц.** Асабліва адстае ў гэтым напрамку абутковая прамысловасьць, якая нават здае тэмпы выкананьня пляну за апошнія месяцы. У ліпені плян выканан на 76,9 проц., а ў жніўні толькі на 68,4 проц. Ня лепш стаіць справа і ў тэкстыльнай прамысловасьці, якая выканала плян за ліпень і жнівень месяцы на 73 проц., а бавоўна-папяровая нават зьнізіла да 66,7 проц.

Асноўнымі прычынамі нездавальняючых вынікаў работы лёгкай прамысловасьці зьяўляецца тое, што партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі раду прадпрыемстваў і галін прамысловасьці не ажыцьцяўляюць дырэктывы XIV зьезду КП(б)Б, дае гаворыцца, што «асноўнай умовай для выкананьня кольскасных і якасных паказальнікаў прамысловасьці ў 1932 — заключным годзе пяцігодкі зьяўляецца бальшавіцкая мабілізацыя ўсёй партыйнай і арганізацыі, усіх рабочых мас на практычнае ажыцьцяўленьне 6 указаньняў **т. Сталіна,** далейшае шырокае разгортваньне і замацаваньне вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва (гаспадарча-разрахунковыя брыгады, суцэрчны прамфінпляны)».

Гэта дырэктыва зьезду партыі, відавочна, не знайшла свайго канкрэтнага прыкладзеньня ў штодзённай практычнай рабоце многіх партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый у справе разгортваньня работы лёгкай прамысловасьці.

Адсутнасьць дастатковага, выразнага, канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва непасрэдна вытворчасьцю з боку раёну гаспадарчых арганізацыі Наркамлёгпраму, аб'яднаньняў, дрэнная пастаноўка тэхнічнага пармаваньня не даюць магчымасьці паставіць на належную выпыню справу ўнутрызаводзкага пляніраваньня, ліквідаваць пануючую яшчэ ў радзе прадпрыемстваў ураўнілаўку ў зарплаце і абязьлічку ў вытворчым працэсе. У выніку гэтага назіраецца нерацыянальнае скарыстаньне дорага каштуючага абсталяваньня і значныя яго прастоі.

«Дняпроўская мануфактура» дае **9 проц.** прастою, з якіх на тэхнічныя непаладкі прыпадае **7 проц.**, па фабрыцы **«Дзьвіна»** з агульнай колькасьці прастою — **56 проц.** адносіцца да прастою па тэхнічных прычынах. Палепшыць справу арганізацыі вытвор часьці, падняць кваліфікацыйны карыснага дзеяньня абсталяваньня, паладзіць плянавы яго рамонт, ліквідаваць абязьлічку, павесьці барацьбу з паломкай абсталяваньня, за ўкараненьне суровай адказнасьці за кожны варштат, за кожны шрубік—такава неадкладная задача ўсёй грамадзкасьці прадпрыемстваў.

Цякучасьць рабочай сілы і па сёнешні дзень зьяўляецца бічом вытворчасьці. За 1-е паўгодзьдзе 1932 г. па прамысловасьці Наркамлёгпраму прыбыло **8.393** рабочых, а выбыла **12.358** рабочых. Зусім недапушчальным зьяўляецца факт бязупыннага росту прагулаў і зьніжэньне працдысцыпліны. Толькі за 1-е паўгодзьдзе прагулы без уважлівых прычын складаюць **5742** чалавека-дні, або **1,14 проц.** усяго рабочага часу, супроць **0,71 проц.** за гэты перыяд мінулага году.

Гэта можна вытлумачыць толькі адной «аб'ектыўнай» прычынай: многія напы гаспадарнікі і прафсаюзныя работнікі забылі ўказаньне тав. **Сталіна** аб тым, што «наш савецкі рабочы жадае жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных, культурных патрэб і ў сэнсе харчовага снабжэньня, і ў сэнсе жыльля, і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і ўсякіх іншых патрэб».

Зьмененыя ўмовы снабжэньня, разьвіцьцё калгаснага гандлю, самазагатоўкі,—ўсё гэта патрабуе ад арганізацый максымуму ініцыятывы і актыўнасьці ў справе далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых.

Невыкананьне плянаў выпуску прадукцыі, дрэнная арганізацыя рабочай сілы ў вытворчым працэсе, нерацыянальнае скарыстаньне яе бязумоўна адбіліся на выкананьні пляну па якасных паказальніках. Замест зьніжэньня сабекошту па Наркамлёгпраму за 1-е паўгодзьдзе паводле пляну на 2,8 проц., фактычна атрымалася павышэньне на 0,8 проц. Асабліва дрэнна стаіць справа ў гэтым напрамку ў шкляной прамысловасьці дзе замест зьніжэньня сабекошту па 1,7 проц., атрымалася павышэньне на 7,7 проц., у швэйнай, запалкавай і інш. галінах вытворчасьці.

Яшчэ і дагэтуль ня ўсюды зьнішчана дыспрапорцыя паміж ростам зарплаты і ростам прадукцыйнасьці працы. За першае паўгодзьдзе замест **18 проц.** павышэньня прадукцыйнасьці працы паводле пляну, ёсьць толькі **5,6 проц.** у той час, як зарплата павысілася на **7,6 проц.** супроць плянавых 6,6 проц.

Разгортваньне шырокага савецкага гандлю, снабжэньне сельска-гаспадарчымі прадуктамі працоўных гораду, патрабуе шпаркага сустрэчнага патоку вырабу прадметаў масавага спажываньня. На лёгкую прамысловасьць ускладаецца вялікая адказнасьць у справе забесьпячэньня сацыялістычнай вёскі прамысловымі вырабамі. Яна павінна даць на **362** мільёны рублёў прадукцыі шыр патрэбу.

Здольнасьць работнікаў і арганізацый працаваць па-новаму ярка ілюструюць значныя дасягненьні ў гэтым напрамку. Так, гута «Пралетары», галянтарэйная фабрыка «Беларуска», панчошна-трыкатажная «КІМ» далі да 1-VII прадукцыі шырспажыву на **600.000 р.** Выканалі пляны за жнівень-месяц **шкляная (100,2 проц.), гарбарная (163 проц.), паліграфічная (134 проц.), швэйная (106 проц.).**

Аднак па многіх прадпрыемствах прадметы шырспажыву пачалі выпуск кацца толькі з ліпеня месяца і пляны ў большай частцы ня выконваюцца. Гэта зьяўляецца вынікам апартуністычных адносін з боку раду гаспадарнікаў да гэтай важнейшай справы, вынікам наўменьня паасобных арганізацый і работнікаў па-бальшавіку мабілізаваць і арганізаваць шырокія колы рабочых навакол гэтага пытаньня.

Больш канкрэтнага кіраўніцтва і ўвагі спрэве арганізацыі вытворчасьці з боку Наркамлёгпраму, аб'яднаньняў, барацьба з прастоямі і расхлябанасьцю ў вытворчасьці, барацьба за павышэньне якасьці прадукцыі, за павышэньне прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў цэх, брыгаду, жорсткая барацьба з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, за выкананьне пляну шырспажыву, разгортваньне спаборніцтва і ўдарніцтва,—вось важнейшыя задачы гаспадарчых, партыйных, прафсаюзных арганізацый.

Ёсьць усе магчымасьці і ўмовы да канца гэтага году зьнішчыць недахопы, ліквідаваць прарывы, забясьпечыць сапраўды бальшавіцкія тэмпы і мэтады работы і выканаць тыя гаваровыя задачы, якія ўскладзены партыяй і ўрадам на лёгкую прамысловасьць.

Партыя патрабуе ад усіх арганізацый стварэньня неадкладнага пералому ў выкананьні прамфінпляну.

ПАСТАНОВА

бюро Менгаркому КП(б)Б ад 15 верасьня 1932 г.

1. Лічыць, што ў першым пункце пастановы бюро ГК ад 5-IX г.г. «Аб арганізацыі збожжазагатовак у аднаасобным сэктары» (апублікаваным у газ. «Зьвязда» ад 15-IX-1932 г.) дапушчана няправільная фармулёўка аб давядзеньні пляну збожжазагатовак да двара.

2. Першы пункт гэтай пастановы зьмяніць і прыняць у наступнай рэдакцыі:

«Старшыням сельсаветаў і сакратаром сельпартгрупак у трохдзённы тэрмін праверыць давядзеньне пляну збожжазагатовак да вёсак і населішчаў.

Пры давядзеньні пляну да вёсак і населішчаў разгарнуць масава-растлумачальную работу, якая дапамагла-б шырокім масам калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў усьвядоміць сувязь паміж збожжазагатоўкамі і ўсім ходам выкананьня народнагаспадарчага пляну».

Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.

За 1.360 тыс. га азімых, 1.500 тыс. га заблiва

Рэалізацыяй насеннай пазыкі ўзьнімем тэмпы сяўбы і зяблiва

Выканаць плян сяўбы азімых

Веснавой паводкай і градабіцьцем была пашкоджана значная частка пасеву азімых 1931 году. У выніку рад калгасаў і саўгасаў з-за адсутнасьці насеньня зацягнулі сяўбу азімых. **Урад пацярпеўшым гаспадаркам адпусьціў насенную пазычку — 60 тыс. пудоў і 60 тыс. пудоў для абмену на яравое збожжа.**

Дапамога, якую аказвае ўрад калгасам і саўгасам, яшчэ лішні раз падкрэсьлівае, што толькі пры пралетарскай дыктатуры, пры існаваньні буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі можна выконваць намечаныя пляны, своячасова аказваць дапамогу гаспадаркам, якія пацярпелі ад стыхійных няшчасьцяў.

Факт адпуску насеннапазычкі калгасьнікамі сустрэнут яшчэ большай мабілізацыяй сваіх сіл на хутчэйшае і добраякаснае выкананьне пляну асеньняй сяўбы і зяблiва.

Задача заключаецца ў тым, каб **неадкладна прасунуць насеннапазычку непасрэдна ў пацярпеўшыя гаспадаркі.** Тым больш, што тэрміны сяўбы прашлі. Кожны пратэрмінаваны дзень з дастаўкай пазычкі будзе адбівацца на ўраджайнасьці азімых 1933 году.

Аднак, на гэтым супакойвацца нельга. Раённыя партыйныя арганізацыі павінны **разгарнуць шырокую масавую работу па мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў,** па арганізацыі сацыялістычнай міжкалгаснай насеннай узаемадапамогі.

Плян сяўбы азімых па БССР рэальны. Ён можа быць і павінен быць выканан поўнасьцю. Треба толькі павесьці самую бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай стаўкай на скарачэньне пляну (Уваравічы), правільна арганізаваць работу палявых брыгад, эфэктыўна скарыстаць каня і трактар на сяўбе.

Дамагаючыся выкананьня кольскасных паказальнікаў, мы павінны з яшчэ большай сілай дамагацца паляпшэньня якасьці работы, павышэньня ўраджайнасьці азімых. Сеяць на дабраякасна падрыхтаванай глебе. Сеяць ачышчаным насеньнем. Поўнасьцю скарыстаць мінэральнае ўгнаеньне.

Тэрміны сяўбы прашлі. Адгэтуль — максымум увагі хутчэйшаму выкананьню пасеўпляну па ўсе 100 процантаў.

Пра забесьпячэньне насеньнем у асеньнюю пасеўную кампанію гаспадарак, у якіх пашкоджаны зімовы клін вясной 1932 г. ад паводак і летам ад градабіцьця

Пастанова Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР ад 20-IX 1932 г.

Для поўнага забесьпячэньня насеньнем у асеньняй пасеўнай кампаніі 1932 г. гаспадарак, у якіх пашкоджан зімовы клін вясной і летам 1932 г., Народны Камісарыят Зямляробства пастанаўляе:

1) Абавязаць раённыя зямельныя аддзелы забясьпечыць гэтыя гаспадаркі насеньнем, у першую чаргу за лік страхавых насенных фондаў, фондаў КСУ, міжраённай і ўнутрыраённай калгаснай насенданамогі.

2) Абавязаць саўгастрэсты забесьпячэньне насеньнем саўгасаў правесьці за лік між саўгаснай насеннай перасоўкі, скончыўшы гэту работу не пазьней 25-IX-32 г.

3) Абавязаць Белкалгаспэнтр, Трактарацэнтр, прыняць самыя рашучыя меры па стварэньні і аказаньні насеннай дапамогі за лік міжраённай і ўнутрыраённай калгаснай насеннай дапамогі.

4) У дадатак да страхавых і насенных фондаў, адпушчаную ўрадам дзяржаўную на сеннапазычку ў колькасьці 1.000 тон і фонду азімага жыта ў колькасьці 1.000 тон у парадку абмену на яравыя збожжавыя, выдаць наступнаму раёнам для забесьпячэньня калгасаў, якія асабліва пацярпелі ад паводак і градабіцьця.

Выдаць у цэнтнэрах

№№ па ч	Назва раёнаў	Насеннапазычкі	Абменам	Разам
1.	Тураўскаму	600	—	600
2.	Мазырскаму	800	—	800
3.	Касьцюковіцкаму	200	900	1100
4.	Чэрыкаўскаму	—	400	400
5.	Гомельскаму	300	1200	1500
6.	Церахаўскаму	150	550	700
7.	Крычаўскаму	—	500	500
8.	Ельскаму	900	—	900
9.	Дзяржынскаму	600	500	1100
10.	Жыткавіцкаму	400	—	400
11.	Талочынскаму	—	500	500
12.	Клімавіцкаму	—	400	400
13.	Уваравіцкаму	—	500	500
14.	Лоеўскаму	300	700	100
15.	Чырвонапольскаму	—	600	600
16.	Полацкаму	—	400	400
17.	Рэчыцкаму (у т. л. з забесьпячэньнем калгасаў калфонду «Заходы»)	1100	—	1100
18.	Пралейскаму	—	500	500
19.	Чэрвеньскаму (пагарэўшаму калгасу)	50	—	50
20.	Хойніцкаму	200	500	700
21.	Пятрыкоўскаму	700	—	700
22.	Нараўлянскаму	1100	—	1100
23.	Чашніцкаму	—	400	400
24.	Любаньскому (камуна БВА)	300	—	300
25.	Кармянскаму	—	500	500
26.	Бялыніцкаму	—	100	100
27.	Лепельскаму	—	300	300

5) Усталяваць, што насенная пазычка, якая выдаецца па лініі Загатэбожжа, павінна быць зьвернута пасеўшчыкамі натурай не пазьней 1-га верасьня 1933 г.

Абменны фонд жыта павінен рэалізавацца выключна ў парадку абмену на яравыя, збожжавыя, апрача проса.

Абавязаць раённыя зямельныя аддзелы, саўгастрэсты, Калгасцэнтр выдачу насеньня жыта па аказаньні насеннай дапамогі рабіць выключна пры ўмове добра падрыхтаванай глебы і выкананьня пасеўшчыкамі агратэхнічных мерапрыемстваў на пасеве.

6) Дазволіць раённым зямельным аддзелам паводле пастановы раённага выканаўчага камітэту ў паасобных выпадках з адпушчанага фонду жыта выдаваць аднаасобным гаспадаркам, у якіх адбылося пашкоджаньне пасеваў.

7) Абавязаць райземаддзелы, Калгасцэнтр, Трактарадэнтр і тэхпроп Наркамзему прыняць рашучыя захады да поўнай мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў, безадкладнага сканчэньня азімай сяўбы і забесьпячэньня выкананьня агратэхнічных мерапрыемстваў па пасеве і доглядзе за азімым клінам.

Народны Камісар Зямляробства БССР РАЧЫЦКІ.

Уваравіцкія апартуністы скарачаюць пасеўпляны

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Уваравіцкі раён увесь час адставаў у веснавой сяўбе, да апошніх дзён ня зыходзіў з чорнай дошкі. Здавалася-б, што райком павінен быў улічыць сумныя ўрокі вясны і своячасова мабілізаваць масы на выкананьне плянаў асеньняй сяўбы і зяблiва.

Аднак, на справе мы бачым зусім іншае. Уваравіцкі раён тапебна адстае і зараз. Плян асеньняй сяўбы на 15 верасьня выканан на 18,3 проц. Раён зноў пападае на чорную дошку.

Яшчэ горш. Па раёне гуляе апартуністычная тэорыя аб нерэальнасьці пасеўных плянаў. Гэта тэорыя пачынае практычна ажыцьцяўляцца кіраўнікамі некаторых калгасаў. Так, калгас **Бязымянны,** Боркаўскага сельсавету, мяркуе засеяць замест 125 толькі 50 га жыта. Калгас **«Чырвоная ліпа»** зьменшыў пасеўны плян па 65 га і г. д.

Райкалгассаюз не забясьпечыў своячасовую падрыхтоўку калгасаў да сяўбы. Многія калгасы яшчэ да сяўбы нават не прыступалі. Калі брыгады калгасу **«Вольная праца»,** Гусявіцкага сельсавету, сабраліся выехаць у поле, дык выявілася, што няма ні аднаго спраўнага плуга. Конская цягавая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна.

Пытаньні якасьці работы зусім выпалі з-пад увагі раённых арганізацый. Насеньне не ачышчана. Збожжаачышчальныя машыны не скарыстоўваюцца. На станцыі Уза яшчэ з вясны ляжыць мінэральнае ўгнаеньне. У калгасы яно не завозіцца. Замест сяўбы жыта па прапашных культурах, яно сеецца па жыце, аўсе і г. д. Пры такой сяўбе высокага ўраджаю не атрымаеш.

Райком партыі можа і павінен па прыклад дзе перадавых раёнаў у бліжэйшыя-ж дні ліквідаваць адставаньне, мабілізаваць масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на ўпчыльненьне тэрмінаў сяўбы і зяблiва.

На аснове шырокай масавай работы і барацьбы з „лявацкім“ адміністраваньнем ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СВАЯЧАСОВУЮ ЗДАЧУ ЗБОЖЖА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРАМ

Кантрактацыя збожжавых культур не праведзена

ВЕТКА. Веткаўскі раён лічыцца адным з адсталых па збожжазагатоўках.

Раён ня выканаў жнівеньскага пляну; ён не павярстаў упушчанага і ў верасьні. Аднаасобны сэктар у загатоўках ня прымае ўдзелу, ён знаходзіцца па-за ўвагай раённых і вясковых арганізацый. Калі шостая пяціднёўка жніўня дала 50 тон збожжа, дык першая пяціднёўка верасьня толькі 28. Як мы бачым, тэмпы не ўзмацняюцца, а наадварот, падаюць.

Тут дала сябе адчуваць няўменьне арганізаваць загатоўкі, зьвязаць іх з уборкай і абмалотам; разгортваньнем масавай работы і ўдарам па кулаку забясьпечыць посьпех кампаніі.

Кантрактацыя збожжавых культур у палове сельсаветаў — (16) своячасова ня была праведзена. Зараз прыходзіцца адначасова даводзіць пляны збожжазагатовак да вёсак і калгасаў, выпісваць кантрактацыйныя кніжкі і мабілізоўваць масы на выкананьне пляну. Па Шарсьцінскім, Радукскім, Тарасаўскім, Дзямянкаўскім сельсаветах да 10 верасьня кантрактацыйных кніжак ня выдалі.

Усё гэта не дало магчымасьці сур'ёзна прапрацаваць пляны, на аснове дыфэрэнцыяванага падыходу да паасобных населеных пунктаў, унікнуць мэханічнага давядзеньня заданьняў.

Сярод часткі нізавых работнікаў існуе апартуністычная думка, што «калгасы вывезуць, з калгасаў лягчэй узяць». Гэта пры водзіць да згортваньня ўсякай масавай работы сярод аднаасобнікаў.

Няглюбская ячэйка, прыкрываючыся шыльдай «плян вялікі, пельга выканаць», літаральна нічога ня робіць, каб загатаўляць збожжа.

Малюнак апартуністычнай бязьдзейнасьці раду арганізацый раёну быў-бы няпоўным, калі-б мы не адзначылі фактыспэкуляцыі збожжам па рынку. Кулак імкнецца разбазарыць збожжа, уцягнуць у гэту справу паасобных калгасьнікаў і аднаасобнікаў. На працягу жніўня ў Ветцы штодзённа па 10—15 вазоў прадавалі збожжа, а пракуратура і міліцыя нічога не рабілі, каб спыніць спэкуляцыю. Толькі ў апошні час яны разгарнулі барацьбу са спэкуляцыяй і знайшлі ў перакупшчыкаў па 4—8 мяшкоў са збожжам.

У радзе сельсаветаў і калгасаў няма кантролю за памольным зборам і своячасовай адпраўкай яго на ссыпныя пункты. У калгасе «Шлях Ільліча» разбазарана 20 тон памольнага збожжа. У сельгаскалёніі «Воля» і інш. мясцох ляжыць на 30-50 тон гарцу.

Вось прычыны, якія перашкаджаюць Веткаўскаму раёну ліквідаваць адставаньне і выйсьці ў рады перадавых барацьбітоў за збожжа.

Кончарэль.

ЗАБЫЛІ ПРА АДНААСОБНІКА

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

ДЗЯРЖЫНСК. Партарганізацыя Дзяржынскага раёну разгарнула вялікую палітычна-масавую работу сярод калгасьнікаў па пытаньні патэрміновай здачы збожжа дзяржаве. Пры разьмеркаваньні плянаў раённыя арганізацыі прытрымліваліся прынцыпу: «хто лепш і больш працуе, той больш атрымлівае». Яшчэ да атрыманьня плянаў была ўстаноўлена ўраджайнасьць у кожным калгасе паасобку.

Плян загатовак быў шырока абгаворан на нарадзе старшынь калгасаў. Удзельнікі нарады высунулі сустрэчныя пляны: камуна «Чырвоны сьцяг» — 0, 5 тон, калгас «Перамога» — 1,5 тон, імя 9-га студзеня — 0,8 тон і інш. Агульныя сходы калгасьнікаў адпадушна галасавалі за сустрэчныя пляны.

Пад лёзунгам: **«датэрміновае выкананьне пляну збожжазагатовак — лепшы адказ рабочым Ленінграду»** праводзіліся раённыя і куставыя зьлёты ўдарнікаў і ўдарніц сацыялістычных палёў.

Паміж калгасамі разгарнулася пераклічкі. Ліст калгасу «Камінтэрн-2» сустрэў шырокі водгук у масах калгасьнікаў. Калгас імя 9-га студзеня ўжо пасьля першага абмалоту даставіў збожжа з поля на ссыпны пункт. Плян загатовак у 18 тон перавыкананы калгасам яшчэ да 1 верасьня — здана 18,8 тон.

У выніку шырока-разгорнутай палітычна-масавай работы калгасы Дзяржыншчыны на 15 верасьня здалі 362 тоны, або 63,7 проц. гадавога пляну. Паасобныя калгасы **«Камінтэрн-2», «9-га студзеня», «Перамога», «Чырвоны сьцяг»** і інш. перавыканалі гадавыя заданьні. Гэтыя посьпехі сьведчаць аб рэальнасьці плянаў, аб росьце вытворчага энтузіязму і актыўнасьці калгасных мас, яны зьявіліся **вынікам мабілізацыі калгасьнікаў і калгасьніц вакол пастаноў партыі і ўраду.**

Але разам з тым пельга абыйсьці моўчкі **недаацэнку арганізацыямі Дзяржыншчыны палітычна-масавай работы ў аднаасобным сэктары.** На 10 верасьня плян збожжазагатовак па Дзяржынскім раёне быў выканан на 42 проц. Раён выйшаў на першае месца па БССР і быў занесен на чырвоную дошку. У работнікаў раёну атрымалася «галавакружэньне ад посьпехаў». Яны зусім забылі, што аднаасобны сэктар займае па сваёй удзельнай вазе 29 проц., што збожжа самацёкам ня пойдзе, што загатоўкі трэба арганізаваць.

Плян збожжазагатовак па аднаасобным сэктары Дзяржынскага раёну складае 235,7 тон. Да 15 верасьня аднаасобнікі здалі 17,9 тон, або 7,3 проц. Аб чым гавораць гэтыя лічбы. Яны гавораць аб адсутнасьці ўвагі да аднаасобнага сэктару.

Асаблівай увагі заслугоўвае «работа» Дзяржынскага гарсавету. Ён разьмяркоўваў пляны габінэтным парадкам. Ёсьць выпадкі дачы непасільных заданьняў бедняком. Камісіі садзейнасьці па вёсках не працуюць. Старшыня гарсавету нават ня ведае, якую ўдзельную вагу займае аднаасобны сэктар у загатоўках. На пытаньне, што старшыня гарсавету і яго намесьнік зрабілі, каб разгарнуць работу сярод аднаасобнікаў, мы атрымалі адказ: «Пісалі членам гарсавету». Вось узор бюракратычных адносін да сваіх абавязкаў — гарсавет піша фармальныя паперкі, а члены савету іх ня выконваюць.

У выніку на 10 верасьня аднаасобнікі прыгарадных населішчаў не здалі ні аднаго кілёграма збожжа. Самацёкам з 10 па 15 верасьня паступіла 35 кгр. (заданьне 10,5 тон), аб якім гарсавет і ня ведае. А кулацка-заможнымі гаспадаркамі дагэтуль ні здана нічога.

Такое-ж становішча і ў радзе іншых сельсаветаў. Аднаасобнікі Байдацкага сельсавету да 15 верасьня здалі 31 кгр. пры заданьні ў 25 тон. Старшыня сельсавету тав. **Вароніч** проста заляжў, што сельсавет дагэтуль ніякай работы па аднаасобным сэктары не праводзіў. Аднаасобнікі **Барыневўскага і Сталінскага** сельсаветаў яшчэ на сёнешні дзень не здалі ні аднаго кілёграму.

Работнікі канторы «Загатзбожжа», якія ў першую чаргу адказваюць за выкананьне пляну, займаюцца толькі тым, што прымаюць збожжа, якое ідзе самацёкам. На пытаньне: «чаму няма паступленьняў ад аднаасобнікаў, вы атрымаеце зусім «шаўны» адказ: «не вязуць». Арганізаваць загатоўкі па аднаасобным сэктары і відавочна палічаць сваёй справай.

Інспэктар райсэнабу тав. **Закс** зўтарытэтна заяўляе: «Мы ўжо прыступаем да работы з аднаасобнікамі». Тав. Закс, як відаць праводзіць загатоўкі па сваім уласным «пляне»: «раней у калгасах, а потым у аднаасобным сэктары».

Што гэта, як не чарговасьць кампаніі!

Калгасы Дзяржыншчыны паказалі, як трэба змагацца за збожжа. Яны дэманстравалі поўную рэальнасьць пляну збожжазагатовак.

Узоры работы перадавых калгасаў павінны быць неадкладна перанесены ў аднаасобны сэктар. Неабходна кінуць буксірныя брыгады перадавых калгасьнікаў на адсталыя вучасткі. Дзяржыншчына павінна па ўсіх галінах збожжазагатовак выйсьці на перадавыя пазыцыі.

Дварэцкі.

Не дапусьціць адміністраваньня пры давядзеньні плянаў!

ЗАСЛАЎЕ. Заслаўскі раён па 15 верасьня выканаў плян збожжазагатовак на 18,3%. У той час, як калгасамі здана 37,3% гадавога пляну, аднаасобныя гаспадаркі здалі толькі 5,2%.

Ёсьць перадавыя сельсаветы, як Назадворскі, што выканалі гадавы плян на 46%. Недапушчальна адстае ў загатоўках Заслаўскі сельсавет, які плян па калгасах выканаў на 10,1%, па аднаасобным сэктары на 0,6%, па цьвёрдых заданьнях — на 17,5%.

У некаторых сельсаветах дапушчаны памылкі і перагібы пры давядзеньні плянаў да вёсак. Па Анусенскім сельсавету плян загатовак па аднаасобным сэктары значна павялічаны параўнальна з мінулым годам: у мінулым годзе на бядняцка-серадняцкую гаспадарку прыпадала 2,3 цэнт., зараз 3,2 цэнт. Старшыня сельсавету т. **Радкевіч** замест масава-растлумачальнай работы займаецца голым адміністраваньнем. Аднаасобнікі падавалі заявы аб неправільных плянах здачы збожжа. Радкевіч на заявах накладаў рэзалюцыі: «Адмовіць, згодна пастановы прэзыдыуму сельсавету». Між тым скаргі сялян нават не разглядаліся на прэзыдыуме сельсавету.

Яркі прыклад. Была падана заява раённаму пракурору па няправільную дачу цьвёрдага заданьня серадняцкай гаспадарцы **Ганькі Шылак.** Пракурор не расьсьледаваўшы скаргі, паслаў яе старшыні сельсавету Дадкевічу для дачы тлумачэньняў. Радкевіч у адказе паведаміў, што заява разглядалася прэзыдыумам, які пастанавіў, што цьвёрдае заданьне дано правільна. Між тым скарга ніколі не разглядалася прэзыдыумам.

Па Сёмка-Гарадзецкім і Гатавінскім сельсаветах кулакі не здалі ні аднаго кілёграму. Прычыны ясныя: сакратар Сёмка-Гарадзецкага сельсавету проста заўляе: «Няма чаго ўзяць у кулакоў». Зразумела, якія вынікі дае апартуністычнае патураньне клясава-варожым элементам.

Брыгадзір «Зьвязды» МАЛІНІЦКІ.

Вынік ударнай работы

У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых—перадавога атраду рабочае клясы—наш калгас **імя 9 студзеня,** Дзяржынскага раёну, да тэрміну выканаў гадавы плян збожжазагатовак. **Мы павінны здаць 18 тон. Здалі да 1 верасьня 18,8 тон.**

Перамога дасягнута дзякуючы цеснаму случэньню ўборкі, малацьбы і загатовак, дзякуючы ўдарнай, адданай рабоце калгасных брыгад.

У мінулым годзе мы здалі дзяржаве 26 тон збожжа, 55 цэнт. вікі і 39 цэнт. гароху. Калгасьнікі атрымалі па **3,2 кгр. збожжа за працадзень.**

У гэтым годзе, дзякуючы мерапрыемствам нашай партыі і ўраду, дабрабыт калгасьнікаў значна ўзьняўся. Паводле папярэдніх падлікаў, калгасьнік атрымлівае па **5,5 кілё збожжа на працадзень.** Пры першым абмалоце мы раздалі авансам 15 проц. абмалоту.

Ад калгаснага гандлю—за продаж малочных прадуктаў, гародніны і інш. калгас выручыў **2.000 р.** Разданы аванс па 65 к. на працадзень. Некаторыя гаспадаркі калгасьнікаў атрымалі па 300 р.

Уборку збожжавых культур мы скончылі да 1 верасьня. Плян азімай сяўбы намі выкананы да 12 верасьня. Зараз мы выконваем высунуты сустрэчны плян сяўбы ў 28 га.

Праўленьне і ўдарнікі калгасу імя 9-га студзеня:
ВЕКША, МАЕЎСКІ, САБАЛЕЎСКІ і ШОТ.

Ажыцьцяўляючы рацыяналізатарскія рабочыя прапановы

ВІЦЕБСКІ ШЧАЦІНА-ШЧОТАЧНЫ КАМБІНАТ ЛІКВІДАВАЎ АДСТАВАНЬНЕ

Р. Южнова і Арк. Зарубежны

Шчаціна-шчотачны камбінат у барацьбе за плян

Віцебскі шчаціны камбінат—адно з буйнейшых шчаціна-шчотачных прадпрыемстваў СССР—уступіў у строй у сьнежні м. г.

У першым квартале камбінат даў выкананьне пляну на 100,9 проц. Але гэты посьпех ня быў замацован і першы месяц другога кварталу быў рэзкім скачком уніз —73 проц. Гэта і было прычынай недавыканаўня прамфінпляну ў другім квартале —97,7 проц.

Уся работа па камбінаце была пастаўлена бясплянава. Імпартнае абсталяваньне не скарыстоўвалася. Сушыльная камэра зусім не працавала. На камбінаце быў адзін кацёл, але і той няспраўны. Закупленае на дзесяткі тысяч руб. абсталяваньне аказалася нягодным.

Дрэнная арганізацыя працы, перавыдаткаваньне сырцу і дапаможных матар'ялаў, няправільнае скарыстаньне рабочай сілы, абязьлічка і ўраўнілаўка, парушэньне працдысцыпліны—вось што панавала на камбінаце ў другім квартале ў выніку апартуністычнага кіраўніцтва дырэкцыі. У маі яно было зьнята.

Новае кіраўніцтва ўзялося за рэарганізацыю цэхаў, рэарганізацыю гаспадарчай сыстэмы, за карэнную пабудову сыстэмы зарплаты, за ўкараненьне зьдзельшчыны і гаспадарчага разрахунку. І ў гэтым напрамку сапраўды праведзена вялізарная работа. Усе рабочыя пераведзены на зьдзельную аплату працы. Ліквідавана ўраўніўка. Цэхі пераведзены на самастойны баланс. Заключаны дагавары, спушчаны нарады-заказы. Створан аддзел тэхнічнага кантролю і плянава-эканамічны аддзел. Склады таксама пераведзены на самастойны ўлік.

Вузкае месца—якасьць. Ніякага кантролю ня было. У першым квартале было забракавана 6 проц. гатовай прадукцыі. Прыёмшчыкі ніякай адказнасьці не адчувалі. Брак і пераробкі даходзілі да 5-6 проц., асабліва ў шчаціным цэху. Патрэбна была рашучая барацьба за якасьць.

Новае кіраўніцтва арганізавала спэцыяльны кантрольны аддзел. На кожным працэсе ўстанавілі прыёмшчыка, які адказвае за брак і пераробкі.

Пытаньне якасьці ня выходзіла з парадку дня адміністрацыйна-тэхнічных нарад. На гэты вучастак была мабілізавана шырокая маса рабочых. Штодзённая, упартая барацьба за якасьць дала свае дадатныя вынікі—брак у другім квартале быў да нядзеи да нуля.

На камбінаце абвешчан дэкадник рабочых прапаноў, які даў звыш 250 прапаноў, шмат з іх вельмі каштоўныя. Спынімся на некаторых з іх.

Рабочы мэханічнага цэху тав. Гуляды знёс прапанову—устанавіць сьвердзел для расточкі пэндзлю чырвонай вязкі. Гэта значна паскарае расточку. Каштоўныя прапановы ўнесьлі таксама рабочыя Хайт, Юртайкін, Бэдэровіч і загадчык наборнага цэху т. Багатыроў. Апошні ўнёс прапанову выпрацоўваць конволяс № 5 для аўтаматаў шавецкіх шчотак. Гэта канчаткова зьнішчае ручную мешку воласу і дае да 6.000 руб. эканоміі ў год. Рабочы Рыхлеўскі прапанаваў з адкідаў дроту рабіць цьвікі і выкайшоў для гэтай мэты варштат.

Творчы энтузіязм рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу знайшоў свой адбітак і ў правядзеньні яшчэ цэлага раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

У аддзелачным цэху мэханізавана рэзка фанэры, у пэндзлявым праводзіцца работа па ўстаноўцы варштатаў для чоскі валос. У шчаціным цэху раней чысты і брудны волас кідалі разам. Зараз пры сартаваньні чысты волас аддаецца ў сушку, а брудны —на машыну для пераробкі.

У гэтым-жа цэху поўнасьцю рэарганізавана сыстэма работы. Раней рабочы рабіў усе апэрацыі, зараз уведзен падзел працы.

Адным з вялікіх дасягненьняў трэба лічыць пераход мэханічнага цэху на плянавапераджальны рамонт абсталяваньня. Раней машыны і варштаты часта спыняліся. Кожны выпадак рамонту выклікаў вялікія прастоі. Шчотачныя аўтаматы стаялі без руху 8 месяцаў. Зараз, пасьля правядзеньня папераджальнага рамонту, мэханічны цэх вылучан у самастойную адзінку і гэтыя дэфэкты ў большасьці зьнішчаны. Больш таго, увесь аўтаматны цэх, які працаваў з вялікімі пераробкі, зараз пушчан па поўны ход. Пушчана часальная машына, якая стаяла няспраўнай больш 6 месяцаў. Устаноўлена 8 новых варштатаў у воласа-прадзільным цэху. Рыхтуюцца да ўстаноўкі скубальнай, часальнай і рассовачнай машын.

У выніку ўсёй праведзенай работы крывая выканаўня прамфінпляну крута ўзьнялася ўверх. Ліпеньскі плян выкананы на 100 проц., жніўеньскі—105 проц., першая дэкада верасьня—101,8 проц. У ліпені і жніўні ня было ніводнага процанту браку.

Дасягнутыя пад кіраўніцтвам партарганізацыі посьпехі ні ў якім разе не павінны затушаваць рад прабелаў у рабоце як гаспадарчага кіраўніцтва, так і іншых кіруючых арганізацый камбінату.

«Вузкім» месцам на камбінаце ўсё яшчэ застаецца шчаціны цэх. За апошні час у гэтым цэху забракавана 450 кілгр. гатовай прадукцыі, перакідка рабочых з месца на месца, з аднаго працэсу на другі яшчэ канчаткова ня зжыта. Слаба вядзецца барацьба з прагуламі і цікучасьцю рабочай сілы. За апошнія тры тыдні ў шчаціным цэху налічвалася звыш 52 прагулаў.

Другім «вузкім» месцам зьяўляецца сталёўка, якая яшчэ далёка ня стала ўзорным цэхам харчаваньня. Якасьць абедаў нізкая, а кошт даходзіць да 1 руб. і больш. За затрыманьнем абедзеных талёнаў вялікія чаргі. На сьвінарніку і трусатніку існуе абязьлічка. За апошні час загінула каля 40 трусоў з прычыны дрэннага догляду іх.

***

Зараз па камбінаце разгорнут конкурс на лепшую падрыхтоўку да Кастрычніцкіх сьвят.

Паміж цэхамі, брыгадамі і масабовымі ўдарнікамі заключаны дагавары па сацспаборніцтву на датэрміновае сканчэньне пляну 3-га кварталу.

Ужо ёсьць канкрэтныя папярэднія вынікі конкурсу. Лік гаспадарча-разрахунковых брыгад павялічыўся ад 41 да 53, якія ахапляюць 60 проц. усіх рабочых камбінату.

Узоры работы паказваюць ударныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады т. Іофэ ў шчаціным цэху, тав. Шнэўра ў пэндзлявязальным, Гэксона, Фёдарава, Вігдэргаўза, Эмануіла—мэханічны цэх. Усе яны выконваюць свае вытворчыя праграмы па 120--130 проц.

Пярэшнства па конкурсу заваёўваюць пэндзлявязальны і мэханічны цэхі. Пэндзлярка па другіх фабрыках была невыстарчальнай. РПО не забясьпечыла сабе ў выстарчальнай ступені апорныя пункты. Слабая работа забастовачнага камітэту і апартуністычная прывычка аглядвацца на ПІС, якая яшчэ сям-там захавалася, прывялі да таго, што забастоўкай было ахоплена толькі 5-6 тыс. рабочых. Забастоўка працягвалася толькі некалькі дзён, яна ня стала ўсеагульнай. Аднак, пытаньне аб забастоўцы тэкстыльшчыкаў ня зьнята тым самым з парадку дня. Пытаньне гэта стаіць перад КПП ва ўсёй паўнаце, і партарганізацыя сумесна з РПО трымаюць рашучы курс у гэтым напрамку, разгортваючы хвалю частковых баёў на асобных фабрыках і групах фабрык і стараючыся перамагаць тыя недахопы, якія прывялі да чэрвеньскай няўдачы.

***

III пленум ЦК КПП канстатаваў, што «тэндэнцыя да пашырэньня забастовачнай барацьбы выступае ўсё мацней. Працэс перарастаньня гэтага роду забастовак ва ўсеагульную забастоўку будзе ўсё больш паскараецца». Сапраўднасьць пацьвердзіла гэту пэрспэктыву (дамброўская забастоўка і ўсеагульная забастоўка 16-III). У сучасны момант задачай дня зьяўляецца разгортваньне буйных масавых баёў, арганізацыя ўсеагульных забастовак у мясцовым і абласным маштабе і падвядзеньне мас да ўсеагульнай забастоўкі па ўсёй Польшчы. Гэта задача патрабуе ўмелага прымяненьня гібкіх, рознародных форм барацьбы, якія адказваюць у кожным выпадку настрою мас і данай сітуацыі.

У апошні час вялікае значэньне набывае захват фабрык, які ўжываецца ўсё часьцей рабочымі. Гэта форма барацьбы не заўсёды бывае аднолькавай. Былі выпадкі, як напрыклад у Гульчынскага ў Дамброўскім басэйне, калі 600 рабочых, пастаўленых перад пагрозай закрыцьця заводу, на працягу трох тыдняў сядзелі на заводзе, не дазвалялі тушыць печы, высылалі дэлегаты ў розныя ўстановы, падалі з ног ад голаду, але не прыступалі да больш рэвалюцыйных форм барацьбы. Аднак, часьцей усяго захват фабрык набывае ярка рэвалюцыйныя формы. Так напрыклад, па днях на фабрыцы Крупэ і Эндэр у Наб'яніцах, калі з 3.400 рабочых адміністрацыя парашыла скараціць 1.200, рабочыя пачалі італьянскую забастоўку і занялі фабрыку. На трэці дзень забастоўкі, як паведамляе прэса, у разультаце работы «камуністычных агітатараў, якія выкарысталі факт страты прытомнасьці адной работніцы», ля фабрыкі сабралася трохтысячная маса рабочых, ад якая б'е па ўсёй сыстэме фашысцкай дыктатуры ў Польшчы,—сацыял-фашысты праб'ю раздрабіць рух, абмежаваць рамкамі фашысцкай законнасьці, утрымаць у максымальна «мірных» формах і накіраваць гэты рух у рэчышча так званага дэмакратычнага (г. зн. капіталістычнага) выхаду з крызісу.

Значная большасьць забастовак была падрыхтавана і ўзначалена прафлевай і КПП. Але на некаторых вучастках барацьбы, па якіх КПП у апошнія гады была слаба, сацыял-фашысты здолелі або ўзяць у свае рукі кіраўніцтва забастоўкамі (Беласток), або сарвадь барацьбу аднадзённай забастоўкай пратэсту (сельгасрабочыя), а ў радзе выпадкаў, дзе ўплыў іх быў ужо зломлен, сацыял-фашысты аднак аказаліся даволі моцнымі, каб процідзейнічаць рэвалюцыйным выступленьням. Аднак і тут у працэсе барацьбы расьлі сілы і ўплыў камунізму. Так, напрыклад, у Беластоку, дзе партыйная арганізацыя сярод тэкстыльшчыкаў была надзвычай слабая, у часе забастоўкі арганізацыя КПП праявіла большую актыўнасьць, значна вырасла, зьвязалася з масамі, заваёўваючы часам нават рашаючы ўплыў на масы змагароў. Таксама і сярод сельгасрабочых. У часе веснавой кампаніі 1932 г. пад рэвалюцыйным кіраўніцтвам прайшло каля 200 забастовак сярод сельска-гаспадарчых рабочых, і хаця КПП і прафлевая ня здолелі яшчэ ў выстарчальнай ступені ўзначаліць узмоцнены рух сотень тысяч сельгасрабочых, аднак партыя ў тры разы павялічыла лік сваіх членаў сярод сельгасрабочых і быў створан рад апорных пунктаў прафлевай.

Сіла і слабасьць рэвалюцыйнага прафруху яркa праявіліся ў часе чэрвеньскіх баёў лодзінскіх тэкстыльшчыкаў. Дзякуючы своячасовай ініцыятыве, дзякуючы рашучаму курсу на забастоўку тэкстыльшчыкаў Лодзі і лодзінскай акругі супроць зьніжэньня зарплаты і ліквідацыі калдагавору, дзякуючы рашучаму адпору ППС і рэфармісцкім прафсаюзам—РПО здолела дабіцца значных посьпехаў, заваяваць на гарадзкім сходзе фабрычных дэлегатаў і прадстаўнікоў большасьць —440 супроць 60, правесьці рэзалюцыю за ўсеагульную забастоўку і стварыць наперакор рэфармісцкім прафбюракратам забастовачны камітэт, якому даручана было кіраваць гэтай забастоўкай. Аднак, падрыхтоўка была недастатковай, і ў выніку гэтага ў часе першага сутычкі з паліцыяй, у часе якіх «з хуткасьцю маланкі перад брамамі фабрыкі пачала вырастаць барыкада». Паліцыя сілай прабавала вызваліць фабрыку, ужываючы ў барацьбе газы. Рабочыя ўзброіліся палкамі, жалезнымі ломамі, пусьцілі ў ход фабрычныя гідранты і салянную кісла ту. Барацьба вялася з жорсткасьцю і працягвалася да раніцы.

Гэта забастоўка служыць клясычным прыкладам, як у працэсе барацьбы за свае непасрэдныя патрабаваньні рабочыя набываюць сьвядомасьць, волю і жаданьне барацьбы з апаратам фашысцкага гвалту.

Заняцьце фабрыкі не павінна быць формай пасыўнага супраціўленьня.

Задачай камуністаў зьяўляецца спалучаць захват фабрыкі з мабілізацыяй мас па-за фабрыкай, з дэманстрацыямі і дэлегацыямі на другія фабрыкі для ўцягненьня іх у салідарную сумесную барацьбу. Заняцьце фабрыкі павінна быць узята як зыходны пункт папярэдняя барацьбы за яе першапачатковыя рамкі і наданьня ёй рэвалюцыйнага размаху.

КПП рашуча змагаецца супроць усякага роду апартуністычных тормазаў, якія перашкаджаюць разгортваньню забастовачных баёў, падрываюць рашучы курс партыі на ўсеагульныя забастоўкі ў мясцовым і краявым маштабе, якія прыніжаюць задачы партыі. КПП разам з тым выступае таксама супроць лёгкадумнага кіданьня лёзунгу ўсеагульнай забастоўкі без адпаведнай групоўнай яе падрыхтоўкі. Выкрываючы фразэалёгію ППС аб усеагульнай забастоўцы, пры дапамозе якой яна дэзарганізуе ўжо пачаты рух па асобных заводах і ў асобных галінах, КПП стараецца кожную атаку капіталу ператвараць у выходны пункт для разгортваньня барацьбы і для пашырэньня гэтай барацьбы на магчыма шырокім фронце.

Усеагульная забастоўка становіцца пытаньнем дня ў Польшчы. Кожная буйная, абостраная барацьба (ўсеагульная забастоўка ў Варшаве, або забастоўка чыгуначнікаў) можа ў сваім разьвіцьці перарасьці ня толькі ў рэпэтыцыю ўсеагульнай забастоўкі, але і ў агульнапольскую ўсеагульную забастоўку. А ўсеагульная забастоўка ў Польшчы паставіць шчыльна перад масамі пытаньне барацьбы за ўладу. Таму партыя ў сваёй агітацыі ўвязвае лёзунг усеагульнай забастоўкі з напулярызацыяй вялікага паўстаньня рабочых, сялян і салдат, як адзінага шляху да зьвяржэньня фашысцкай дыктатуры, да рэвалюцыйнага выхаду з крызісу.

***

Рэвалюцыйны рух у гарадох Польшчы не ізаляваны. Рэзэрвы пралетарскай рэвалюцыі—сялянскі і нацыянальна-вызваленчы рух—разрастаюцца. Калі гэты рух у вёсцы да апошніх тыдняў можна было характарызаваць, як растучы, але распылены, то ў сучасны момант ён ужо пачынае перамагаць сваю распыленасьць, пашыраць свой ахоп і пераходзіць да больш вострых, вышэйшых форм барацьбы.

Працоў ужо той час, калі масавы рэвалюцыйны сялянскі рух разьвіваўся галоўным чынам у акупаваных абласьцях. Амаль адначасова з бунтам у Лесько адбываліся сутычкі ў Ядаве, мястэчку, якое знаходзіцца каля Варшавы. Тут сялянне адмовіліся плаціць за права ўезду ў горад (т. зв. «рогаткове») і за права гандлю на рынку. Сялянне выступілі ў абарону рэвалюцыйнага агітатара. Адбылася схватка з паліцыяй, у часе якой забіта некалькі сялян і былі паранены паліцэйскія.

Выступленьні сялян у Астапыне, Ядаве, Лесько ня былі выступленьнямі асобных вёсак. Гэта былі масавыя, шматтысячныя выступленьні сялян усёй акругі, накіраваныя вострыём супроць дзяржаўнага апарату. Калі іх нельга яшчэ разглядаць, як тыповыя для ўсёй масы сялян, дык неабходна адзначыць, што яны, зьяўляючыся на даным этапе самым высокім праяўленьнем барацьбы сялян з фашысцкай дзяржавай, указваюць шлях, па якім будзе разьвівацца ўвесь сялянскі рух. Самавольная рубка лесу, якая часта ўжываецца сялянамі, захват памешчыцкіх пашаў, баі на гэтай глебе з паліцыяй і барацьба супроць фашысцкай камасацыі—ўсё гэта ўказвае, што сялянскі рух мае тэндэнцыю перарастаньня ў рэвалюцыйную барацьбу за зямлю і што лёзунгі, кінутыя КПП, усё больш ператвараюцца ў жыцьцё.

Усё гэта ўказвае, што пралетарскі рух згуртоўвае вакол сябе вялікія масы працоўных і што па шляху рэвалюцыйнай барацьбы ідзе ўперад ня толькі авангард. Усё гэта гаворыць за тое, што Польшча падыходзіць шчыльна да рэвалюцыйнага крызісу.

Польшча стаіць перад тварам новых клясавых баёў. Буржуазія вядзе цяпер наступленне на масы камунальных рабочых, тэкстыльшчыкаў, нафтавікоў і г. д. Атакуецца сама сыстэма калектыўных дагавароў. Капітал стараецца раздрабіць рабочую клясу, атакаваць кожную фабрыку асобна, кожны цэх асобна. Перад КПП стаіць задача пашыраць гэтыя баі, спалучаць іх з масавымі рэвалюцыйнымі дэманстрацыямі, ператвараць кожны буйны эканамічны канфлікт у масавую рэвалюцыйную забастоўку. Разгортваючы эканамічныя і палітычныя забастоўкі, італьянскія забастоўкі, забастоўкі пратэсту і салідарнасьці, вулічныя выступленьні і г. д., КПП падводзіць рабочыя масы да ўсеагульнай палітычнай забастоўкі.

Мабілізуючы ўсе сілы для перамаганьня труднасьцяй, якія сустракаюцца на яе шляху, КПП у першую чаргу стараецца [illegible]міць дывэрсыю сацыял-фашызму, які мае яшчэ сур'ёзны ўплыў у рабочай клясе і заваяваць рабочых, што ідуць за ППС і іншымі згодніцкімі партыямі на свой бок. Партыя разгортвае шырокую кампанію адзінага фронту вакол самых элемэнтарных рабочых патрабаваньняў, у абарону быту рабочых, супроць фашысцкага тэрору, супроць падрыхтоўкі вайны. Камуністычная партыя дабіваецца вялікіх посьпехаў у галіне стварэньня адзінага фронту барацьбы. Аднак, адзінафрантавая практыка ўсё яшчэ не набыла паўсюднага і пастаяннага характару.

Камуністычная партыя ўвязвае штодзённыя баі з барацьбой за зьвяржэньне фашысцкага рэжыму, за савецкую Польшчу. Партыя выкрывае ілжывы характар «дэмакратычнага выхаду з крызісу», які праповедуецца ППС, і дэманструе на прыкладзе СССР, што **адзінай дэмакратыяй для працоўных зьяўляецца савецкая дэмакратыя, г. зн. дыктатура пралетарыяту.**

Адначасова партыя накіроўвае галоўны агонь супроць усякага адраджэньня ілюзіі ў адносінах ППС, супроць правага апартунізму, які бачыць у ППС аб'ектыўна рэвалюцыйную сілу, які бачыць у «левых» малюрах ППС фактар, што аблягчае рэвалюцыйную барацьбу пралетарыяту і штурхае партыю на шлях згодніцтва з правадырамі ППС. Партыя рашуча выступае супроць усякіх тэндэнцый да блёкаў з ППС. Гэтыя апартуністычныя ілюзіі і капітулянцкія тэндэнцыі зьяўляюцца важнейшай унутрыпартыйнай перашкодай да пашырэньня фронту барацьбы і самастойнага кіраўніцтва барацьбой.

Спалучаючы забастовачную барацьбу пралетарыяту з сялянскімі выступленьнямі, спалучаючы масавую рэвалюцыйную забастоўку з разьвязваньнем элемэнтаў аграрнай рэвалюцыі і з нацыянальна-вызваленчым рухам прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў, КПП вядзе працоўныя масы Польшчы да рашаючых баёў за ўладу.

*) Канец. Пачатак гл. у № 211.

Ст. Марэк

Рэвалюцыйны ўздым у Польшчы*)

Прызыў пачаўся

ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА (Менск). Дзень 20 верасьня зьяўляецца першым днём работы прызыўнай камісіі. Сёньня першымі ў рады РСЧА па гораду Менску прызываюцца маладыя рабочыя мэталюргічнага заводу імя Кліма Варашылава.

На заводзкім двары, у сталовай, прызыўным пункце і дзе толькі можа спыніцца вока разьвешаны лёзунгі і плякаты.

«Будзь гатоў прыняць на сябе ганаровую назву байца рабоча-сялянскай Чырвонай арміі» — гэтыя словы прымушаюць задумацца кожнага з прызыўнікоў, ці гатоў ён стаць з вінтоўкай у руках на варце сацыялістычнай бацькаўшчыны СССР.

У лекутку кацельнага цэху, які зараз ператворан у прызыўны пункт, сабраліся прызыўнікі. Усяго іх на заводзе 52 чалавекі. Пераважная большасьць з іх члены КП(б)Б, ЛКСМБ, ударнікі вытворчасьці. Разам з прызыўнікамі 1910 году прыходзяць з заявамі добраахвотнікі 1911, 1912, 1913 гадоў. Кожны прыйшоў на прызыўны пункт з вялікім жаданьнем стаць воінам армії пралетарыяту. Але ў кожнага яшчэ схавалася маленькая нячэўпенасьць: «А мо ня прымуць... Падкачаю здароўем. Баец-жа Чырвонай арміі павінен быць моцны целам і духам».

Прызыўны пункт забясьпечан літаратурай, газэтамі, адкрыта бюро юрыдычных даведак. Тут-жа па месцы выбіраецца матар'ял у насьценгазэту прызыўнікоў.

Сакратар парткалектыву заводу праводзіць гутарку з прызыўнікамі аб клясавай сутнасьці РСЧА, пасьля чаго наладжваецца чытка газэт на тэму «апошнія міжнародныя падзеі».

Прызыўнікі праходзяць медагляд. Кожны з нецярпеньнем чакае, калі будзе дан заключны выпіс прызыўнай камісіі і напісана «годзен».

Тут-жа ў часе работы прызыўная камісія выяўляе сына ліпэнца. Гэты факт, перш за ўсё гаворыць што партыйна-камсамольская арганізацыя і прафсаюзныя органы заводу пытаньня клясавага адбору да апошняга дня прызыву не надавалі належнай увагі, выпікам чаго да прызыўной камісіі быў дапушчан сын ліпэнца.

Прызыў пачаўся. Але гэта не азначае, што работа заводзкіх арганізацый па прызыву скончана. Цяпер яшчэ з большай прызыву скончана. Цяпер яшчэ з большай пралетарскай пільнасьцю трэба змагацца за клясавае, пісьменнае, здаровае папаўненьне РСЧА.

М. В-скі.

Прызыўнікі 1910 году вывучаюць кулямёт.

Навучальны год пад пагрозай зрыву

Лагойск.

У параўнаньні з мінулым годам у Лагойскім раёне значна пашырылася школьная сетка першага і другога канцэнтру. Калі ў мінулым годзе было 64 школ, то ў гэтым годзе павінна працаваць 68 школ. Замест 11 ШКМ—15.

Пашыраньне школьнай сеткі абавязвала райапа, партыйныя, камсамольскія ячэйкі і сельсаветы мабілізаваць усю грамадзкасьць з тым, каб да 1-га верасьня правесьці поўную падрыхтоўку школ.

Між тым, новы навучальны год раён спаткаў з вялізарнымі прарывамі. **32 проц. школьных памяшканьняў засталося неадремантаванымі.** З дрычыны гэтага 1-га верасьня распачалі заняткі толькі 43 школы.

У будынку Прудзішчанскай ШКМ цячэ страха, шыбы выбіты, лавы паламаны.

Старшыня сельсавету тав. Коўзан гаворыць, што рамонт школы гэта не яго справа. Райапа яшчэ да гэтага часу не пакланапіўся аб прызначэньні ў гэту школу загадчыка. Таксама з прычыны адсутнасьці рамонту не распачалі заняткаў і Рэбрышчанская школа, Лагойская яўрэйская, Косінская, Падонкаўская і некаторыя школы Слабоджацкага сельсавету.

Райком КП(б)Б і РВК павінны мабілізаваць усе сілы на ліквідацыю прарываў па ўсенавучу, вінаватых прыцягнуць да адказу пасьці.

Навучальны год па Сураскім раёне распачаўся пры значным недахвацe настаўнікаў. На сёньняшні дзень іх не хапае 13 чалавек.

Асабліва дрэнна стаіць справа з настаўнікамі для яўрэйскіх школ. Пасьля сканчэньня 1931-32 навучальнага году, з яўрэйскіх школ выехалі без ведама райана 3 настаўнікі. Два настаўнікі Наркамасьветы перавёў у другі раён, а замест іх ня прыслаў ні аднаго. Апрача таго ў гэтым годзе адкрываецца 7-я група яўрэйскай сямігодкі, што патрабуе яшчэ двух настаўнікаў. Яўрэйская двухкамплектная школа ў мястэчку Сураж з прычыны неўкамплектаванасьці яе настаўнікамі яшчэ не пачынала працаваць.

Няма праграм для другога канцэнтру па грамадазнаўстве, матэматыцы і інш. Падручнікамі школы забясьпечаны па першым канцэнтры на 10-15 проц., па другім—на 2-3 проц. Пры школах няма майстэрань (нават узорная ФЗС ня мае іх), памяшканьні не адпавядаюць патрабаваньням школ. Новыя будынкі, ня гледзячы на тое, што яны будуюцца ўжо 1-2 гады, яшчэ ня скончаны.

Нездавальняюча пастаўлена справа забясьпечаньня настаўніцтва. З прымацаваных да калгасу 119 настаўнікаў, па справе забясьпечваюцца толькі 50 проц. (БЕЛТА).

ПЫТАНЬНЯХ ...ЛАСАВАЙ РАБОТЫ

19-2... верасьня ў ЦК КП(б)Б адбылася нарада па пытаньнях агітацыйна-масавай работы.

На нарадзе прысутнічалі загадчыкі агітмасавых аддзелаў 6 раёнаў, 6 чалавек агітмасаў вытворчых ячэек, 11 групагітатараў, цалкам курсы групагітатараў — 25 чал. і курсы-канфэрэнцыя агітмасаў райкомаў у ліку 17 чал.

19 нарада заслухала даклад тав. ЛЕНЦНЭРА аб перабудове агітмасавай работы і 20 раніцою даклад т. АШАРОВІЧА аб арганізацыі ных пытаньняў агітацыйнай работы.

Пасьля дакладаў разгарнуліся спрэчкі.

Тав. КУЗЬНЯЦОЎ («Сьцяг індустрыялізацыі», Віцебск), тав. СЕРАБРАНСКІ («Бальшавік», Менск), тав. БЕРНШТЭЙН (Гомсельмаш) у сваіх прамовах дзяліліся вопытам уже праробленага ў галіне перабудовы агітмасавай работы і, у прыватнасьці, у справе наладжваньня работы агітканектываў і групагітатараў.

За імі выступалі тав. МАНЬКОЎСКІ (друк. імя Сталіна), тав. ЛІЎШЫЦ, ЛАПКОЎ (Магілеў), БОНДАРАЎ (чыг. Віцебск), КАМІСАРЧЫК (Гомель, гарком КП(б)Б), РУБІНШТЭЙН (Віцебск), ВАЎЧКОЎ, БАШМАЧНІКАЎ (Менск, гарком КП(б)Б), СКУПІНАЎ («Сьцяг індустрыялізацыі»), РАХМАНІНАЎ («Бальшавік»), АНДРЭЙЧЫК, ГУСІН, ВІЛЬЧЭК і інш.

Спрэчкі адбываліся ўсё раняшняе і вячэрняе пасяджэньне 19-га, а таксама раняшняе пасяджэньне 20-га верасьня. Вечарам 20-га пасьля заключнага слова тав. Ленцнэра з вялікай прамовай аб задачах агітацыі выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. ІВАНОЎ.

Гомельскія чыгуначнікі выклікаюць на сацспаборніцтва ўсіх паравозьнікаў БССР

Да 15-цігодзьдзя Кастрычніка чыгуначнікі Гомеля ўзялі абавязацельства паўдарнаму разгарнуць асеньня-зімовыя перавозкі. Паравозьнікі дэпо Гомеля вядуць баявую падрыхтоўку да трэцяга ўсесаюзнага конкурсу спараных брыгад, які пачнецца 1 лістапада. Абвешчан унутрыдэпоўскі конкурс на лепшую брыгаду па падрыхтоўцы да ўсесаюзнага, і выкліканы на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе паравозьнікі Беларусі.

Канкрэтна паравозьнікі бяруць абавязацельствы: змагацца за здаровы і культурны паравоз, ацяпліць і адрамантаваць кантрольныя будкі, дабіцца 100 проц. выканаўня пляну сьледаваньня цягнікоў па раскладах, давесьці карысную працу паравозаў да 12 гадзін, павялічыць эканомію апалу на 15 проц. і замацаваць спаранныя брыгады.

Рабочыя дэпо—сартыровачнага абавязаліся дабіцца да 15-й гадавіны Кастрычніка ліквідацыі адставаньня вагоннай гаспадаркі і давядзеньня процанту хворых вагонаў да 0,8 замест наяўных 1,48 проц. Кожны месяц выпускаць з бягучага рамонту 150 вагонаў. Рамонтнікі ўзялі абавязак—поўнасьцю выкарыстоўваць старыя запасныя часткі. Шляхавікі 26 дыстанцыі—выконваць сваю вытворчую праграму і палепшыць якасьць рамонту шляхоў.

Працаўнікі службы эксплёатацыі—змагацца за зьнішчэньне ўсіх непаладкаў на пасажырскім вакзале, за добрае абслугоўваньне пасажыраў і сваячасовую адпраўку цягнікоў.

Разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва паміж зьменамі і брыгадамі дэпо. 15-годзьдзе Кастрычніка чыгуначнікі Гомеля абавязваюцца сустрэць поўнай рэалізацыяй узятых абавязацельстваў, новымі перамогамі на фронце аздараўленьня транспарту і разгортваньня асеньня-зімовых перавозак.

Гасман.

ГОМЕЛЬ, ВІЦЕБСК І БАБРУЙСК

маюць усе магчымасьці хутка выканаць фінплян трэцяга кварталу

ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ III КВАРТАЛУ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН

(Артыкул нам. наркамфіна т. Ляхава)

Фінансавы плян трэцяга кварталу ставіць выключна важныя запатрабаваньні перад фінансава-крэдытнай сыстэмай, перад ударнікамі фінансавага фронту і ўсёй грамадзкасьцю.

Трэці квартал зьяўляецца кварталам шырока разгорнутага гаспадарчага будаўніцтва, кварталам завяршэньня праграмы дарожных работ, кварталам, у які пачаліся і разгарнуліся рознага роду загатоўкі.

Ва ўмовах бягучага году трэці квартал прад'яўляе асаблівыя патрабаваньні яшчэ і таму, што ў гэтым годзе ўсе разьлікі за загатоўленыя прадукты праводзяцца па шляхам безнаяўных разрахункаў, як гэта мела месца ў мінулым годзе, а за наяўны разрахунак. З другога боку, трэці квартал зьяўляецца кварталам найбольшай насычанасьці грашовымі сродкамі як калгаснага, так і аднаасобнага сэктараў вёскі. Апрача тых вялікіх сродкаў, якія паступаюць у распаўджэньне насельніцтва ад заработкаў па рознага роду загатоўках, дарожняму будаўніцтву, сэзонных работах і г. д., грашовыя сродкі асядаюць на вёсцы і ў выніку шырока разгорнутага калгаснага гандлю с.-г. прадуктамі.

Найшырэйшыя магчымасьці для выкананьня фінансавага пляну ў трэцім квартале павінны былі забясьпечыць яго бесьпрабойнае, своечасовае і поўнае выкананьне па ўсіх сыстэмах. На жаль, выкананьне плян па мабілізацыі сродкаў па даных на 10 верасьня на 70,1 проц. і кантрольнага заданьня па абагуленым сэктары—на 67,1 проц. паказваюць, што выкананьне фінансавага пляну знаходзіцца пад пагрозай зрыву і што пэлы рад гарадоў і раёнаў не змаглі па-бальшавіцку разгарнуць работу па выкананьні пляну, ня ўзьнялі барацьбы за яго выкананьне на ўзровень важнейшых палітычна-гаспадарчых задач. Толькі чатыры раёны—**Заслаўскі, Мьсціслаўскі, Клімавіцкі і Сіроцінскі** датэрмінова выканалі і перавыканалі свае пляны. **Лельчыцкі, Старобінскі, Чырвонаслабодзкі, Любаньскі, Брагінскі, Тураўскі, Жыткавіцкі, Лагойскі, Лёзьнянскі, Аршанскі, Дзяржынскі, Слуцкі, Бешанковіцкі, Менскі** раёны набліжаюцца да іх выкананьня. Рад іншых раёнаў да гэтага часу ня могуць выйсьці з глыбокага фінансавага прарыву.

Ва ўмовах тых сур'ёзных задач, якія стаяць перад фінансава-крэдытнай сытэмай і ўсёй савецкай грамадзкасьцю ў трэцім квартале, зусім незразумела і недапушчаль на адставаньне і зрыў пляну такімі буйнымі пралетарскімі цэнтрамі, як Гомель, які выканаў 67,5 проц., Віцебск — 69,7 проц., Бабруйск — 51,9 проц., асабліва побач з тымі раёнамі, якія паказалі прыклад барацьбы за выкананьне пляну, разгарнулі шырокую арганізацыйна-масавую работу, паказалі найлепшыя формы і мэтады барацьбы за выкананьне пляну. Адставаньня гэтых раёнаў нельга цярпець. Грамадзкасьць і фінансава-крэдытныя работнікі гэтых пралетарскіх цэнтраў зараз-жа павінны правесьці баявую шраўорку ўсіх вучасткаў работы, мабілізаваць усе свае сілы на ліквідацыю адставаньня, стаць у першых радох па выкананьні пляну.

Усе адстаючыя гарады і раёны павінны ўсьвядоміць тую вялізарнейшую адказнасьць, якую яны нясуць у справе выкананьня фінансавага пляну, зразумець тое, што сваёй безадказнай работай яны зрываюць выкананьне фінансавага пляну рэспублікі ў цэлым, ставяць пад пагрозу выкананьне вялізарнейшай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, спрыяюць створэньню недапушчальных у савецкіх умовах каса вых труднасьцяй. Адстаючыя раёны павінны ажыцьцяўляць на практыцы формы і мэтады работы перадавых раёнаў.

Выразнай расстаноўкай сіл, уменьнем пабальшавіцку спалучаць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі з выкананьнем фінансавага пляну, дабіцца яго поўнага і своечасовага выкананьня па ўсіх раёнах па ўсіх плацяжох—такава /задача.

З 11 ашчадкас працуе-8

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў трэцяга кварталу па Бялыніцкім раёне ідзе надзвычай дрэнна. Па абавязковых плацяжох—сельгаспадатку і страхоўцы кварталь ны плян выканан на 50,5 проц. Кантрольнае заданьне па паступленьнях грошай ад рэалізацыі пазыкі чацьвертага завяршальнага на той-жа тэрмін выканана на 8 проц. Рэалізацыя акцый Трактарацэнтру складае 19,9 проц. пляну.

Калгассыстэма—МТС і райкалгассаюз—зусім нічога не зрабілі ў справе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Сярод калгаснікаў не праведзена ніякай растлумачальнай работы аб значэньні пасьпяховай рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Ня лепшае становішча і ў рабоце райашчадкасы, яна ня кіруе работай ашчадкас пры сельсаветах. У выніку з 11 прыпісных кас, якія ёсьць у раёне, працуе толькі 8.

Райфа ня стала на чале работы па мабілізацыі сродкаў. Ён ня даў бальшавіцкіх тэмпаў у гэтай рабоце і зусім не забясьпечыў апэрацыйнага кіраўніцтва работай сельскіх саветаў.

У Ланкеўскім сельсавеце да гэтага часу яшчэ ня скончан улік аб'ектаў абкладаньня па с.-г. падатку, ня выпісаны і не даручаны платнікам акладныя лісты.

Інспэктар райфа, які ведае падатковымі справамі, тав. **Качанаў**, літаральна нічога ня робіць. На запытаньне, колькі ў вашым раёне кулакоў, адказвае: «У нас кулакоў няма, нам ні адзін сельскі савет не прадставіў аб гэтым матар'ялаў».

Між тым у **Цяцеранскім** сельскім савеце, пад самым носам сельскага савету, жыве **Шульман Мэер, які** ў мінулым годзе, будучы абкладзен у індывідуальным парадку, плаціў 1.600 руб. падатку, а ў гэтым годзе на яго налічана толькі 9 руб. Даходнасьць-жа гэтай гаспадаркі па працягу году выявілася ад здачы ў арэнду 3-х кватэр па 30 руб. у месяц—360 руб. у год, і ад продажу расады, гуркоў і інш. гародніны па спэкуляцыйных цэнах—больш 2.000 руб. Сельскі савет аб гэтым добра ведае, але ня прымае належных мер для абкладаньня яго ў індывідуальным парадку.

У райфа няма сталага ўліку мабілізацыі сродкаў па сельсаветах. Інспэктар па падатках ня ведае, якія сельсаветы ідуць уперадзе па мабілізацыі сродкаў, якія адстаюць і якім патрэбна дапамога з боку раённага фінансавага аддзелу.

Сельсаветы не ўцягнулі ў работу па мабілізацыі сродкаў актыў, не расставілі сіл і ня прымусілі кулака і заможніка ўнесьці ў тэрмін належачыя з яго абавязковыя плацяжы. Вось галоўныя прычыны дрэннага ходу мабілізацыі сродкаў у Бялыніцкім раёне.

Раённыя арганізацыі не папулярызуюць добрых прыкладаў работы паміж сельсаветамі і не пераносяць формы і мэтады работы перадавых сельскіх саветаў у адстаючыя. Напрыклад, Фэлікс-Конаўскі і Кудзінскі сельсаветы дзякуючы добра праведзенай арганізацыйна-масавай рабоце па мабілізацыі сродкаў, уцягненьні ў яе актыву, дабіліся добрых вынікаў. **Фэлікс-Конаўскі сельсавет** замест вызначаных па III квартал паводле пляну 500 руб. с.-г. падатку, выканаў 2.084 руб., па страхоўцы замест 500 руб. выканаў 3.929 руб., па рэалізацыі пазыкі замест 2.625 руб., выканаў 3.170 руб., **Кудзінскі сельсавет.** па с.-г. падатку даў больш 100 проц. выкананьня квартальнага пляну. Таксама перавыканаў заданьне па страхоўцы і па рэалізацыі пазыкі. Шмат якія сельсаветы ўжо набліжаюцца да выкананьня даных ім пляноў. Але аб гэтых прыкладах іншыя сельсаветы ня ведаюць.

Паказальнікі выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў у перадавых сельскіх саветах ярка сьведчаць аб тым, што ў кожным сельсавеце ёсьць усе магчымасьці для поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну. Трэба толькі ўзяцца за працу так, як за яе ўзяліся Фэлікс Конаўскі і Кудзінскі сельсаветы.

Багданаў.



Гомельскі завод сынтэтычнага каўчука, які ў хуткім часе будзе пушчан.

За дзейснасьць лістоў рабочых і калгасьнікаў

ДЫРЭКТАР ТЛУМАЧЫЦЬ

«Зьвязда» 9 верасьня гэтага году зьмясьціла ліст рабочага **Наркевіча** з дрэваапрацоўчага камбінату **«Камінтэрн»** (Барысаў) аб незаконным звальненьні яго з работы. Ён быў звольнен за нявыхад на працу. На працу-ж ён ня выйшаў таму, што ня ведаў даручанай яму работы і ня мог ёю кіраваць. «... Я папярэдзіў загадчыка лесацэху, што ў тым выпадку, калі станкавых ня зьменяць, я ня выйду на работу, бо зноў будзе псаваньне варштатаў і брак». **Наркевіч не хацеў, каб з-за яго няўменьня зрывалася работа лесацэху і ён прасіў зьняць яго з гэтай работы.** І калі яго просьбу не задаволілі, ён загадзя папярэдзіў, што ня выйдзе на работу, бо ад гэтага будуць толькі страты заводу.

Інакш тлумачыць дырэктар заводу **Блоцкі**: «... Яго нежаданьне ісьці працаваць у цэх я разглядаў, як баязнь труднасьцяй і, па-мойму, так яно і здарылася. Бо пасьля водпуску ў сувязі з уборачнай кампаніяй частка рабочых не зьявілася на работу».

Здаецца ясна. Наркевіч, ня маючы кваліфікацыі майстра, дырэкцыяй ставіцца на гэту работу. Аб умовах, у якіх быў пастаўлен Наркевіч, часткова кажа вытрымка з адказу дырэктара. Але Наркевіч на работу пайшоў, спадзяючыся, што яму дапамогуць, як слабому работніку, што дырэкцыя і абяцала.

Стаўшы на работу, ён убачыў, што з работай не спраўляецца і дапамогі ніякай няма. Яго варштаты ня выконваюць пляну і даюць шмат браку. Бачачы ўсё гэта, Наркевіч ставіць пытаньне рубам — для забясьпячэньня бесьперабойнай і добраякаснай работы варштатаў трэба яго замяніць лепшым працаўніком. І ў адказ атрымлівае ... звальненьне з работы.

Рабочая грамадзкасьць абурана. Таварыскі суд камбінату ўстанаўлівае няправільнае звальненьне Наркевіча. Але рабочыя кваліфікуюць нявыхад Наркевіча на работу, як невытрымаласьць, і штрафуюць яго ў карысьць АСО. Дырэктару-ж за бюракратычны падыход да справы выносяць вымову.

Дырэктар абуран такой крыўдай «... у выніку таварыскі суд зказаў гэту справу, абмежаваўшыся штрафам Наркевіча, а мне, як дырэктару, за тое, што назначыў Наркевіча загадчыкам зьмены, таварыскі суд вынес вымову, а гэта пацьвярджае, што таварыскім судом па камбінаце ніхто ня кіруе».

Але з вывадамі пачакайце, тав. дырэктар. Калі суд устанавіў вашу вінаватасьць, дык вы ўжо і вывадзіце састрашалі: «... таварыскім судом па камбінаце ніхто ня кіруе». Як-бы вы ні стараліся, што суд і Наркевіч ня маюць рацыі, не дажакаце. **Змазваць відавочную справу і выгароджваць сябе з ліку вінаватых, калі вы на самой справе вінаваты, не да твару чырвонаму дырэктару.**

Мы ад вас чакаем яшчэ аднаго лісту з пералічэньнем канкрэтных захадаў да сапраўднага ўрэгуляваньня справы, бяз гэтай шкоднай гульні ў паперкі.

А—ы.

Кулакі развальваюць калгас

(Ліст камсамольцаў)

У ліпені г. г. калгас **«Праўда», Сакалінскага** сельсавету, Талочынскага раёну, даведзен быў да развалу. Вінаваты ў развале кулакі, якія пралезьлі ў калгас—Збуржынскі і Белабжэцкі.

Калгасны актыў, беднякі камсамольцы выявілі шкодніцтва і была пагорнута работа па ўмацаваньні калгасу.

Справу Збуржынскага і Белабжэцкага перадалі ў Талочынскую РСІ і ў райкалгассаюз. Агульны сход калгаснікаў пастанавіў аддаць Белабжэцкага пад суд.

Прайшло ўжо некалькі месяцаў, а ні адна з арганізацый, якім даручана гэта справа, нічога не зрабілі.

Белабжэцкі ўсімі спосабамі прабуе ўкацавацца на пасадзе старшыні калгасу. Калгасны актыў увесь час даюе з кулацкай групай і, зразумела, адчувае патрэбу ў дапамозе райарганізацыі.

Калгаснікі абураны нядбайнымі, бязудзельнымі адносінамі раённай РСІ і райкалгассаюзу да іх работы па ўмацаваньні калгасу.

Для таго, каб калгасу не пагражаў новы зрыў у рабоце, неабходна прыцягнуць да адказнасьці кулакоў Белабжэцкага і Збуржынскага.

Камсамольцы:
КРАСАЛОВІЧ, ЗБУРЖЫНСКІ. М.

Трэба скончыць зямельную неразьбярыху

(Ліст камунара)

У **Быхаўскім раёне** ёсьць рад выпадкаў зямельнай неразьбярыхі, парушэньня цьвёрдага зямлякарыстаньня.

У нашай камуне імя **Карла Лібкнэхта** быў перадзен ад калгасу «Чырвонае Дняпро» вучастак сенажаці ў 20 га. Калі камунары прышлі касіць сенажаць, то частка яе ўжо была скошана. Аказваецца, што Быхаўскае райза адзін і той-жа вучастак сенажаці дала і камуне, і аднаасобнікам. З-за гэтай сенажаці паміж нашай камунай і аднаасобнікамі вышлі спрэчкі, якія, як вядома, да нічога добрага ня прыводзяць.

Тое-ж самае і з пахацьцю. Адзін і той-жа вучастак перадалі і камуне, і аднаасобнікам.

Гэта характарызуе, наколькі безадказна адносіцца Быхаўскі РВК да адводу зямельных вучасткаў. Пастанова ЦВК аб устанаўленьні цьвёрдага зямлякарыстаньня зараз мае асаблівае значэньне.

Я. Лабаты.

Па сьлядох лістоў

У «Зьвязьдзе» 5 верасьня (№ 199) быў зьмешчан ліст камсамольца са Смалявіцкага раёну пад назвай **«Разарваць зачараганае кола»**, у якім ён пісаў аб «лявацкіх» перагібах у **Юраўскім** сельсавеце, Смалявіцкага раёну.

Раённы пракурор, праверыўшы гэту справу, устанавіў, што да гаспадаркі **Сабалеўскага Яўхіма**, аб якой пісаў аўтар лісту, няправільна даведзена цьвёрдае заданьне. **Цьвёрдае заданьне з Сабалеўскага зьнята.**

***

У адказ на ліст **«Установа пад данянком»**, сьледчы пракуратуры г. Менску паведамляе, што факты, указаныя ў лісьце, пацьвердзіліся. Прарав Менбуду Гінзбург за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў і цкаўленую безгаспадарчасьць **з работы зьнят і адданы пад суд.**

ВІНАВАТЫХ НЕ ЗНАЙШЛІ

Пры вызначэньні аб'ектаў абкладаньня сельскагаспадарчым падаткам групы сялян вёскі „Вярбеж" (Чэрыкаўскі раён), улічылі даходнасьць ад незямляробчых работ у суме 483 рублі.

Сяляне адмовіліся плаціць, бо нідзе не працавалі і ніякіх незямляробчых даходаў ня мелі.

Але мала адмовіцца. Каб не плаціць, прышлося ўзяцца за высьвятленьне справы. Пачалі безрэзультатныя хаджэньні з аднэй установы ў другую.

Перш за ўсё сяляне зьвярнуліся да старшыні РВК Афанасенкі і былі ім накіраваны ў райфа. З райфа пашлі ў сельсавет, бо тав. Ялоза (райфа) не адаволіўся копіямі рэгістрацыйных картак даходу, а патрабаваў квітанцыі.

У другі раз зьявіліся ў райфа з арыгіналам квітанцый, якія між іншым ледзь выпрасілі. Тав. Ялоза паглядзеў квітанцыі і выявіў, што яны памечаны дарожным аддзелам. Дарожны аддзел ёсьць у Крычаве і ён прапанаваў сялянам сходзіць у Крычаўскі райфа.

Пашлі ў Крычаўскі раён, які ў 36 клм. ад нашага Чэрыкаўскага раёну і прынесьлі даведку ад сельсавету з просьбай даць тлумачэньне па рэгістрацыйных картках.

У даведцы адзначалася, што ўсе мы ў апошні час працавалі на месцы працы і сельсавет лічыць памылковым прысылку картак, але павінен мець тлумачэньне райфа ў пісьмовай форме.

Мы паказалі даведку, пагутарылі і атрымалі такі адказ: „можа карткі накіраваны з шасбуду, ці з якой іншай установы. Даведайцеся. Мы іх не пасылалі".

Пашлі па ўказаных установах, усюды пыталіся, высьвятлялі і ўсюды атрымлівалі адзін адказ: „у нас гэткіх рабочых ня было. Карткі ня намі пасланы. Нарэшце, бяз усякіх вынікаў, з рэзалюцыяй Крычаўскага райдараддзелу аб тым, што ў іх ніякіх вестак няма, мы вярнуліся ў Чэрыкаўскі раён.

Мы накіраваліся ў РСІ —адзінае месца, дзе мы яшчэ ня былі. Старшыня Чэрыкаўскага РСІ выслухаў нас і паслаў допіс у райфа.

Райфа, атрымаўшы допіс з просьбай паведаміць адкуль атрыманы рэгістрацыйныя карткі па незямляробчых даходах, адказаў даведкай наступнага зьместу: „рэгістрацыйныя карткі атрыманы пасылкай, ўстанавіць адкуль яны прысланы зараз немагчыма".

З гэтым дакумантам зноў пашлі ў РСІ і нарэшце апошні візыт у сельсавет з даведкай РСІ. У даведцы вызначалася, што калі ў сельсавеце ёсьць дакладныя весткі аб месцы нашай работы за апошні час і рэгістрацыйныя карткі прысланы памылкова, дык іх ня трэба залічваць у кошт падаткаў.

Сума ў 483 руб., якая была вызначана памылкова, з нас зьнята. На гэтым справа скончылася.

Чэрыкаўскія арганізацыі не пацікавіліся тым, хто-ж пачаў гэткую шкодную цеганіну, па чыёй віне 5 чалавек губілі рабочыя дні і сродкі, бяз вынікаў ходзячы з аднэй установы ў другую.

Не адшукаць вінаватага блытаніны, не прыцягнуць яго да адказнасьці, як гэта зрабіла Чэрыкаўская РСІ, гэта значыць патураць гэткім учынкам.

Разумаў.

ПРАФ. С. І. ЖУРЫК

СІЛАСАВАНЬНЕ БУЛЬБЫ

Партыя і ўрад асобна падкрэсьлілі значэньне кармовай базы для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў СССР. На высока арганізаванай кармовай базе прадукцыйнасьць нашай жывёлагадоўлі павінна значна павысіцца. Аднэй з асноўных нашых задач, не аслабляючы ўвагі ні на мінуту да самой жывёлы, а наадварот узмацняючы яе, будзе створэньне магутнай кармовай базы.

У сьвінагадоўчых гаспадарках, бульба, як кармовая культура, ва ўмовах БССР і падобных ёй раёнах, будзе займаць значнае месца. Калі ў 1933 годзе ў кармовым балянсе сьвінагадоўчых калгасаў і СТКФ запраектавана не каля 21 проц., дык у 1937 годзе гэтая лічба дойдзе да 37,40 проц. Гэта і зразумела, бо бульба ў 2—3 разы дае большы ўраджай у кармовых адзінках з адзінкі плошчы насеву, чым іншыя культуры. Апрача таго, бульба зьяўляецца добрым корман для сьвіней. Яна вельмі карысна для парасят сасункоў, а таксама і ад'ёмышаў. Бульбу (вараную) вельмі добра ядуць усе сьвіньні. Яна служыць для павялічэньня апэтыту сьвіней. Бульба зьяўляецца лепшым кармовым сродкам для бэконнага адкорму. Яе ядуць бэконныя сьвіньні да 50—60 проц. ад дачы. Якасьць бэкону пры карміленьні бульбай атрымліваецца добрая. Без бульбы ў БССР і падобных ёй раёнах нельга займацца інтэнсыўнай сьвінагадоўляй. Бульбе ў сьвінагадоўчых гаспадарках сацсэктару павінна быць аддана асаблівая ўвага. Гэта культура зьяўляецца асноўнай для сьвінагадоўлі.

Як культура працаёмкая, бульба патрабуе большай колькасьці рабочай сілы. У сувязі з гэтым усе работы па пасадцы, догляду, уборцы і хаваньні бульбы павінны быць мэханізаванымі. У гэтых адносінах у СССР прароблена вялікая праца. Цэлы рад работ мэханізаваны. Спраектаваны і вырабляюцца камбайны па ўборцы бульбы, памыйцы, праварзаньні, мяцьці і г. д.

Момантам, які тормозіць павялічэньне культуры бульбы, зьяўляецца яе захаваньне. Маючы 75 проц. у сваім складзе вады, бульба хутка псуецца і патрабуе спэцыяльных бульбахавальнікаў ці буртахавальнікаў. Пры тых ці іншых умовах бульба трацінь на працэсы дыханьня ў лепшым выпадку 25 проц. спажыўных матэрый. Бульба часта гніе, ад чаго страты яшчэ павялічваюцца, а апрача таго патрабуецца дадатковая рабочая сіла на пераберку бульбы і яе прасушваньне. Асеньняя ўборка бульбы запазваецца тым, што яе трэба рабіць толькі ў добрае надвор'е, бо ўбраная вільготная бульба хутка псуецца. Для буртаваньня ідзе шмат саломы, якая ў нячорназемнай паласе вельмі неабходна на корм і подсьціл для сьвіней. У сувязі з тым, што бульба ня можа захоўвацца летам, тэрмін карыстаньня яе скарачаецца па 4—5 месяцаў у году. Усё гэта стварае многа нязручнасьцяй па хаваньні бульбы. Асабліва гэтыя нязручнасьці адчуваецца ў буйных сацыялістычных гаспадарках, дзе даводзіцца мець справу з вялізарнай колькасьцю бульбы.

Высунутая і вырашаная ў апошні час у Германіі і ў нас праблема сілісаваньня бульбы палягчае цяжкасьці пры ўборцы і хаваньні яе. Вопыты, праведзеныя ў Навукова-Дасьледчым Інстытуце сьвінагадоўлі ў Менску, далі бліскучыя вынікі. У часе вопытаў была засілісавана бульба вараная, сырая, прамёрзлая вараная і прамёрзлая сырая. Усе гэтыя віды бульбы былі скормлены жывёле. Вараная засілісаваная бульба дала лепшыя вынікі ў сэнсе паяданьня, чым сырая сілісаваная. Сырая бульба паядалася падсьвінкамі ня больш 35 проц. ад кармовай дачы. Якасьць гэтай бульбы была ніжэй варанай сілісаванай. Страты спажыўных матэрый пры сілісаваньні варанай бульбы бываюць ня больш 5 проц., а сырой да 10—15 проц.

Значэньне сілісаваньня бульбы для сьвінагадоўчых гаспадарак вялізарнае. Яго трэба па магчымасьці хутчэй укараняць ў вытворчасьці сацыялістычнага сэктару.

Калегія Наркамзему БССР 8 жніўня 1932 г., ухваліўшы розьультаты вопытаў Інстытуту сьвінагадоўлі, зусім правільна і выразна вырашыла прасоўваць сілісаваньне бульбы ў вытворчасьць, як масавы вопыт. Калегія абавязала сьвінаводчыя трэсты рабіць сілісаваньне бульбы ва ўсіх сьвінаводчых саўгасах ня менш 4—5 гаспадарак па кожным трэсьце і па лініі калгасаў правесьці таксама сілісаваньне бульбы.

Уся павуковая кансультацыя, зьвязаная з сілісаваньнем бульбы, Наркамземам даручана Навукова-Дасьледчаму Інстытуту сьвінагадоўлі. Гэтай справе павінна быць аддана максымальная ўвага і дапамога.

Сілісаваньне бульбы зьяўляецца не складаным працэсам. Яно можа быць праведзена ва ўсіх саўгасах, калгасах бязумоўна пры ўважлівых адносінах да гэтай справы. Уся работа па сілісаваньні зводзіцца да наступнага:

Прамыўцы бульбы і ачыстцы яе ад бруду. Запарцы бульбы (калі яна сілісуецца вараная), падрыхтоўцы сілісных ям і траншэй, закладцы ў ямы і траншэі, трамбаваньні і закрываньні.

Перад закваскаваньнем бульба павінна быць прамыта. У непрамытай бульбе ня будзе ісьці сілісаваньне. Прамываць бульбу можна ў спэцыяльных бульбамыйках. Пры адсутнасьці бульбамыек прамыўку можна рабіць пажарнай помпай. Для прамыўкі яны паяўнасьці рэкі можна пабудаваць скрыні так, каб праз іх працякала вада. Для затрыманьня бульбы пры спуску вады ставіцца рашотка. Вечарам у такі басэйн засыпаюць бульбу, а раніцой прамытую вадой можна вымаць і апрацоўваць далей.

Прамытую бульбу запарваць у запарніках. Запарку можна зрабіць у звычайных катлох, у запарніках, што ёсьць у саўгасах. Добра можна правесьці запарку там, дзе ёсьць вінакураныя заводы — у апараце Генца. Вельмі добра зрабіць запарку бульбы лёкамабілем у звычайных пчыльна зробленых фурманках-скрынях. Зробленыя з добрых дошак скрыні, прыстасаваныя на калёсах, могуць у полі прымаць бульбу, і пасьля прамыўкі яе ў гэтых прыстасаваньнях, запарваюцца. Пара бярэцца з лёкамабілю і праводзіцца ў скрыню з бульбай пры дапамозе адпаведнай трубы. Праз 1—2 гадзіны працы лёкамабілю 2—3 тоны бульбы могуць быць запараны.

Пры прапарцы ў калёсах-скрыні ў сярэдзіну ўстанаўляецца труба дыямэтрам у ¾—1 дэцімэтр. У трубе робяцца тры рады адтулін для праходжэньня пары. Адлегласьць паміж адтулінамі павінна быць 15 см., а дыямэтр саміх адтулін 0,5 см. Труба пры дапамозе гумавага рукава спалучаецца з параабразавацелем лёкамабілем. Калі ў якімнебудзь месцы скрыні корм недаволі прапаран, дык у гэтым месцы адтуліны пашыраюцца да 0,6—0,7 см.

Пры прапарцы памытая бульба засыпаецца ў яму 0,50 м. х. 1,50 м. і даўжынёй 6 м., добра ўкрываецца і прапускаецца праз трубу пара ад лёкамабіля. Параправодзячая труба робіцца таксама як і пры запарцы ў калёсах з скрынямі. Пры запарцы ў скрынях абавязкова трэба мець сток для кандэнсуючай вады.

Сілісуецца бульба ў звычайных ямах і траншэях, толькі сьценкі іх павінны быць вельмі моцнымі, інакш яны ад націску могуць дэфармавацца ці разрывацца. У вежах сілісаваць бульбу нельга, таму што сьценкі ня вытрымаюць націску.

Перад сілісаваньнем сьценкі ям і траншэй ачышчаюцца і бялюцца сьвежагашанай вапнай.

Пры сілісаваньні недапараванай бульбы апошняя пасьля мыцьця рэжацца на бульбарэзцы і засыпаецца ў яму. У яме ці траншэі бульба пчыльна ўтрамбоўваецца. Каб унікнуць разрыву сьценак ад бурнага бражэньня напаўняць яму ці траншэю трэба ня больш чым на дзьве трэці. Праз 2—3 дня пасьля шумнага бражэньня яма запаўняецца цалкам. Трымаць адкрытай яму больш 2—3 дзён ня трэба, інакш бульба будзе гніць. У выпадку, калі сілісуецца даволі правяленая бульба ці вельмі дрэнна зрэзаная, якая ня выпускае сок, дык да яе дадаецца 0,5 проц. паваранай солі. Зьверху ямы кладзецца 25—30 см. сухая саломеная рэзка для наглынаньня вадкасьці, што выдзяляецца з бульбы. Зьверху рэзкі кладзецца гліняная пакрышка з вільготнай гліны таўшчынёй 25—30 см. Прапараная бульба пасьля запаркі мнецца і гарачай паступае ў яму, дзе яна пчыльна трамбуецца. Пасьля запаўненьня ямы зьверху кладзецца пакрышка з вельмі змочанай саломенай рэзкі таўшчынёй 10—15 см. і зьверху гліняная пакрышка. Можна сілісаваць бульбу з мякінай і сечкай так, каб вільготнасьць сілісу была 65—75 проц. Насыпаць паверх гліны зямлёю, каб унікнуць разрыву ямы, ня трэба. Для захаваньня сілісу ад прамярзаньня паверх ямы кладзецца салома.

Бражэньне ў сілісе канчаецца ў некалькі дзён, але корм лепш скарыстоўваць праз 2—3 тыдні пасьля закладкі сілісу.

Ва ўскрытых ямах корм бярэцца абавязкова кожны дзень ня менш 5 см., інакш ён будзе ад датыканьня з паветрам псавацца. Лепш рабіць выемку корму ў гарызантальным напрамку, адразаючы кожны дзень пласт корму зьверху да нізу. Пасьля ўзяцьця корму адкрытыя месцы зараз-жа закрываюцца саломенымі матамі, мяшкамі і г. д. Асабліва трэба зьберагаць сілісаваную бульбу ад дажджу, ад якога яна хутка псуецца. Над сілісными ўстаноўкамі павінна быць абавязкова страха.

Пры вылічэньні аб'ёму сілісных ямы неабходна выходзіць з таго, што ў 1 кбм. утрымліваецца каля 20 цэнтн. сілісаванай бульбы. Дзённая патрэбнасьць для сьвіньні, што адкармліваецца, выражаецца ў 4,5 кгр., а буйнай рагатай жывёлы 16 кгр. на штуку.

На практыцы існуе шмат спосабаў ацэнкі сілісаванай бульбы. Колер сілісу павінен быць магчыма больш падобен на сыруэ бульбу. Шэра-чорны колер паказвае на нязгодасьць гніі і разлажэньня, зьявішча якое паотул трэба адносьці за лік невыстарчальнай ізаляцыі ад паветры і дрэннага прапарваньня. Пры даволі інтэнсыўным прапарваньні, наадварот, зьяўляецца мутны карычнева-жоўты колер. Пах павінен быць прыемна сьвежы, крыху кісловаты, ці падобны да сьпелай садавіны. Сілас не павінен мець затхлага ляпрыемнага паху, ні гніючых матэрый. Смак добрага сілісу павінен быць прыемна-сьвежы і кісловаты.

(Працяг на 2 стар.).

„ЗДАНЬ ГОЛАДУ БЛУКАЕ ПА ГЕРМАНІІ“

Прэса пачынае прадвыбарчую кампанію

БЭРЛІН, 19. У сувязі з назначэньнем новых выбараў у рэйхстаг **на 6 лістапада** ўсл прэса прысьвячае артыкулы пэрспэктывам далейшага ўнутрыпалітычнага разьвіцьця Германіі. Правая, блізкая да ўраду прэса, падкрэсьлівае, што цяперашні курс ураду фон-Папэна павінен быць захован незалежна ад рэзультатаў выбараў. Орган рурскай цяжкай прамысловасьці «Дэйчэ Бэргвэрк Цэйтунг» піша: «Германскі народ перажывае самую цяжкую галечу. Яго жыцьцё ў небясьпецы. Здань голаду блукае па Германіі. Для торгу паміж партыямі няма больш часу. Цяпер трэба працаваць па-дзелавому, трэба дзейнічаць. Урад ужо пачаў гэтую дзелавую працу. Таму трэба пакінуць гэты ўрад. Якую карысьць можа прынесьці зьмена ўраду? Дзе ён гэты габінэт партыі цэнтру і нацыянал-сацыялістаў, які мог-бы замяніць сабою габінэт фон-Папэна і дзе праграма гэтага габінэту? Аб перагаворах паміж абедзьвюма партыямі нічога ня чуваць. Адпак, гаспадарка ня можа больш чакаць».

Далей артыкул крытыкуе палітыку нацыянал-сацыялістаў. Газэта выказвае крайняе незадаваленьне фактам назначэньня новых выбараў у рэйхстаг, якія яна лічыць зусім бескарыснымі.

Гугенбэрг у артыкуле, надрукаваным у «Бэрлінэр Лёкаль Айцэйгер» і ў «Дэр таг» піша: «Пытаньне аб тым, ці прынясе цяперашні ўрад выратаваньне залежыць ад шляху, па якім ён пойдзе. Само сабой зразумела, што мы пазітыўна падтрымаць тых, хто актыўна выступае супроць парлямантарызму, гэтага асноўнага зла. Гугенбэрг заяўляе, што трэба поўнасьцю перабудаваць дзяржаву». Блізкая да ўраду «Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг» піша аб неабходнасьці згоды ўраду з нацыянал-сацыялістамі, асабліва падкрэсьліваючы, што становішча нацыянал-сацыялістцкай партыі зараз рэзка зьмянілася ў нявыгодны для яе бок. На словах газэты без нацыянал-сацыялістцкага руху нельга ажыцьцявіць таго, што яшчэ неабходна зрабіць для Германіі. «На жаль, — піша газэта,— мы можам толькі перасьцерагчы. Выратаваньне залежыць ад ураду і кіраўніцтва нацыянал-сацыялістцкай партыі».

Адказны рэдактар «Бэрлінэр Тагеблят» **Тэодар Вольф** піша: «Новыя выбары набылі-б важнае значэньне толькі ў тым выпадку, калі-б удалося зьмяніць выбарчае права, пакончыць з усёй сыстэмай выбараў па выбарчых сьпісах і ў першую чаргу пазбавіць выбарчых праў маладых выбаршчыкаў».

Урад фон-Папэна „рыхтуецца“ да выбараў

БЭРЛІН, 19. Урад фон-Папэна робіць далей спробы ПАШЫРЫЦЬ СВОЙ ПАРЛЯМАНЦКІ БАЗІС. Гэтыя спробы ідуць у першую чаргу па лініі збліжэньня з партыяй цэнтру, і уплывовыя колы якой праяўляюць схільнасьць да згоды з урадам. Трэба, напрыклад, адзначыць той факт, што ў галасаваньні аб давер'і ўраду ў рэйхстагу 12 верасьня ня прымалі ўдзел рад кіруючых членаў фракцыі партыі цэнтру, у тым ліку старшыня гэтай партыі і буйны прамысловец Клекнэр.

Адначасова выразна намячаецца ЗБЛІЖЭНЬНЕ ПАМІЖ УРАДАМ ФОН-ПАПЭНА І БАВАРСКІМ УРАДАМ, на чале якога стаіць баварская народная партыя. (Баварская народная партыя, як вядома, фактычна прадстаўляе сабой арганізацыю, якая адпавядае партыі цэнтру). Урад прабуе таксама дасягнуць збліжэньня з базай партыі цэнтру —З КАТАЛІЦКІМІ ПРАФСАЮЗАМІ. На зьезьдзе каталіцкіх прафсаюзаў у Дусэльдорфе выступіў германскі міністр працы ШЗЛЕР, які падкрэсьліў жаданьне ўраду супрацоўнічаць з каталіцкімі прафсаюзамі.

У той жа час блізкія да ўраду колы, стараюцца скарыстаць прадвыбарчую кампанію для ўзмацненьня ўраду. У Бэрліне адбылася ўстаноўчая канфэрэнцыя «германскага нацыянальнага саюзу», праграма якога зводзіцца да «прыстасаваньня Вэймарскай канстытуцыі да жыцьцёвых патрэб краіны», да скасаваньня навязаных Германіі граніц мірных дагавораў. Наогул трэба адзначыць, што ў прадвыбарчай кампаніі блізкія да ўраду колы асноўны ўпор робяць на замежную палітыку, выкарыстоўваючы ў сваіх інтарэсах барацьбу, пачатую фон-Папэнам за патрабаваньне роўнапраўя ва ўзбраеньнях.

БЭРЛІНСКІЯ МЭТАЛІСТЫ РЫХТУЮЦЬ АДПОР

БЭРЛІН, 19. 18 верасьня ў Бэрліне адбылася канфэрэнцыя, скліканая рэвалюцыйнай прафапазыцыяй, у якой прымала ўдзел 500 дэлегатаў ад рабочых бэрлінскіх мэталязаводаў. Канфэрэнцыя ўхваліла рад надзвычай важных пастаноў **аб актывізацыі барацьбы бэрлінскіх мэталістаў супроць спроб правесьці зьніжэньне зарплаты.** Па радзе мэталёвых прадпрыемстваў Бэрліну гэта барацьба ўжо пачалася. Сёньня выбухнула забастоўка рабочых мэталістаў у прадмесьці Бэрліну. 18 верасьня, з прычыны гэтага быў расклеен загад адміністрацыі аб тым, што на аснове надзвычайнага дэкрэту зарплата рабочым за апошнія 10 тыдняў зьніжаецца на 50 проц. і адначасова ўстанаўліваецца 5 рабочых дзён на тыдзень. На заводзе «Вольф Нэтэр Унд Якобі» ў прадмесьці Бэрліну рабочыя ўжо на працягу 2 дзён праводзяць італьянскую забастоўку супроць 20 проц. зьніжэньня зарплаты.

Далейшы рост беспрацоўя ў ПАЗШ

НЮ-ЁРК. Паводле афіцыяльных даных БЕСПРАЦОЎЕ Ў ПАЗШ у апошнія некалькі месяцаў ПАВЯЛІЧЫВАЛАСЯ БОЛЬШ ПАСКОРАНЫМ ТЭМПАМ, ЧЫМ У ПАЧАТКУ КРЫЗІСУ. Міністэрства працы паведамляе, што колькасьць занятых рабочых у ліпені зьнізілася НА 4 ПРОЦ., агульная сума вызначанай зарплаты зьнізілася НА 8 ПРОЦ. Найбольш вялікае беспрацоўе — у прамысловых цэнтрах. Коўтая «амэрыканская фэдэрацыя працы» паведамляе, што ў ліпені агульная колькасьць беспрацоўных сярод членаў прафсаюзаў, якія належаць да фэдэрацыі, складала 34 ПРОЦ.

Зарплата сельгасрабочых таксама рэзка зьнізілася. Так, міністэрства земляробства ў сваёй справаздачы паказвае, што на 1 ліпеня бягучага году зарплата сельгасрабочых была на 29 ПРОЦ. НІЖЭЙ, ЧЫМ У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ў той жа пэрыяд. Дзесяткі тысяч батракоў не атрымліваюць платы грашыма, а ПРАЦУЮЦЬ ЗА ХАРЧЫ І ПАМЯШКАНЬНЕ ПА 14 ГАДЗІН У СУТКІ І БОЛЬШ.

ЯПОНІЯ-АМЭРЫКАНСКАЯ БАРАЦЬБА

Прасоўваньне японскіх імпэрыялістаў з Манчжурыі ў правінцыю Жэхэ, якая адкрывае доступ у Цэнтральны Кітай, выклікала абвастрэньне японска-амэрыканскіх адносін.

У Вашынгтоне ўяўляюць сабе тое, што ў канкурэнтаў апэтыт прыходзіць у часе яды, што Манчжурыя ўжо больш не задавальняе ваяўнічых японскіх імпэрыялістаў.

Амэрыканская дыпляматыя таксама непакоіцца ўзмацненьнем актыўнасьці Японіі ў Шанхаі ў сувязі з узмацненьнем антыяпонскага байкоту, яна баіцца новай высадкі японскіх войск у гэтым важнейшым порце, адкуль па рацэ Янцзы шлях вядзе ў глыбіню Кітаю. Хоць амэрыканскія капіталаўкладаньні ў Кітаі ў сучасны момант не асабліва вялікія, кітайскі рынак расцэньваецца амэрыканскімі імпэрыялістамі як рынак, які мае ў сабе вялізарныя магчымасьці. Да **таго-ж барацьба за Кітай — гэта барацьба за панаваньне на Ціхім акіяне,** за подступы да Індыі-Кітаю і Індыі, за багатыя сырцом востравы Галяндзкай Індыі. Амэрыканскі імпэрыялізм, які яшчэ на раньняй стадыі свайго разьвіцьця накіраваўся ў Ціхі акіян (захват Філіпін і Гавайскіх астравоў, прарыцьцё Панамскага каналу), ня можа дазволіць свайму канкурэнту гаспадарыць на Далёкім Усходзе.

Вось чаму прэзыдэнт Гувэр у сваёй прамове, у якой ён афіцыяльна згадзіўся ў другі раз выставіць сваю кандыдатуру, напомніў Японіі, што ПАЗШ ня маюць намеру прымірыцца з захватам Манчжурыі. З гэтай прамовай супадае ажыцьцёўнае выступленьне амэрыканскага міністра замежных спраў Стымсона, умяшаньне амэрыканскіх банкаў з мэтай зьнізіць курс японскай іены, паніск Вашынгтону на камісію Лігі нацый, якая езьдзіла ў Манчжурыю, з мэтай заваротнасьці не спраўдзячу супроць Японіі. Вельмі паказальна таксама тое, што амэрыканскае марское міністэрства парашыла адтэрміновать зварот амэрыканскага флёту з Ціхага акіяну да месца яго звычайнай стаянкі ў Атлянтычным акіяне.

Усё гэта выклікае рэзкае раздражненьне японскага друку. **«Какумін»** наконт таго, што амэрыканская эскадра накідаецца ў водах, піша, што ПАЗШ маюць намер стварыць пастаянную пагрозу Японіі. Японія, — гаворыць газэта, — ня можа заставацца спакойнай, пакуль ПАЗШ не адмовяцца ад сваёй мары аб Ціхім акіяне». Яшчэ больш адкрыта выказваецца орган японскіх мілітарыстаў «Ніхон». «З аднаго боку, ПАЗШ, — абураецца газэта, — зачынілі для японскіх эмігрантаў дзьверы ў Амэрыку, з другога — яны перашкаджаюць Японіі калянізаваць Далёкі Усход». Са становішча, якое стварылася, — гаворыць гэты рупар японскай ваеншчыны,—ёсьць адзін толькі выхад: **«пачаць вайну з Амэрыкай».** Японія ўзмоцнена рыхтуецца да насьпяваючай ваеннай сутычкі з ПАЗШ (гэтыя прыгатаваньні, з другога боку, накіраваны таксама супроць працоўных мас Кітаю і СССР).

Такійскі карэспандэнт «Н'ю-Ёрк Таймс» піша: «Актыўнасьць японскіх ваенных фабрык, а таксама ўвоз ваенных матар'ялаў у нязвычайных памерах прыцягвае ўвагу замежных палітычных назіральнікаў у Токіё. Хоць, як думаюць, знарады і ваенныя матар'ялы, выдаткаваныя Японіяй у часе шанхайскіх апэрацый, ужо папоўнены новымі запасамі, ваенныя фабрыкі і заводы працуюць з поўнай нагрузкай, некаторыя з'іх нават круглыя суткі. У ваколіцах Токіё адкрыт новы хэмічны завод, павялічваецца выраб аэраплянаў».

Усё часьцей чутны ваенныя пагрозы і з другога берагу Вялікага акіяну. Былы начальнік амэрыканскай авіяцыі Мітчэль выступае з артыкуламі, у якіх заклікае да пашучага павялічэньня амэрыканскага флёту, якому, паводле яго слоў, належыць выключная роля ў будучай вайне з Японіяй. Старшыня камісіі амэрыканскага сэнату па ваенна-морскіх справах **Хэйль** б'е трывогу з прычыны морскіх узбраеньняў Японіі і заклікае іх «перакрыць».

І калі, ня гледзячы на ўсё гэта, ПАЗШ пакуль не адважваюцца адкрыта выступіць, дык гэта ў значнай ступені тлумачыцца тым, што **яны спадзяюцца на «перарастаньне» вайны супроць Кітаю ў вайну супроць дзяржавы, якая будуе сацыялізм — супроць СССР.**

У той-жа час ПАЗШ вымушаны лічыцца з ваеннай магутнасьцю Японіі і адсутнасьцю падтрыманьня з боку Англіі і Францыі. **Амэрыканска-японскі антаганізм аднак усё больш насьпявае; хмары над Ціхім акіянам згушчаюцца.**

РАДЫЁГРАМА

рэдактара. [illegible] йгазэт, агітмасам ГК і РК КП(б)Б

Згодна пастановы [illegible] ЦК КП(б)Б, Культпроп і агітмас. аддзелы ЦК [illegible]кіяюць куставыя нарады рэдактароў [illegible] райгазэт і агітмасаў РК на пытаньні збожжазагатовак.

Нарады адбудуцца ў наступных пунктах:

1. У Менску—25 верасьня з удзелам раёнаў: Менскага, Дзяржынскага, Заслаўскага, Смалявіцкага, Барысаўскага, Бярэзінскага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Бягомльскага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага.

2. У Віцебску—27 верасьня з удзелам раёнаў: Віцебскага, Гарадоцкага, Сураскага, Лёзьнянскага, Сіроцінскага, Бешанковіцкага і Сеньненскага.

3. У Гомелі—27 верасьня з удзелам раёнаў: Гомельскага, Веткаўскага, Буда-Кашалёўскага, Уваравіцкага, Церахаўскага, Рэчыцкага, Лоеўскага, Жлобінскага, Рагачоўскага, Кармянскага.

4. У Магілеве—27 верасьня з удзелам раёнаў: Магілеўскага, Бялыніцкага, Чавускага, Мсьціслаўскага, Крычаўскага, Клімавіцкага, Касьцюковіцкага, Чырвонапольскага, Быхаўскага, Чэрыкаўскага і Прапойскага.

5. У Бабруйску—27 верасьня з удзелам раёнаў: Бабруйскага, Парыцкага, Клічаўскага, Асіпавіцкага, Глускага, Стара-Дарожскага, Слуцкага, Капыльскага, Чырвонаслабодзкага, Любаньскага і Старобінскага.

6. У Мазыры—25 верасьня з удзелам раёнаў: Мазырскага, Жыткавіцкага, Пятрыкоўскага, Брагінскага, Хойніцкага, Ельскага, Нараўлянскага, Лельчыцкага, Тураўскага і Камарынскага.

7. У Воршы—27 верасьня з удзелам раёнаў: Аршанскага, Лепельскага, Чашніцкага, Дубровенскага, Талачынскага, Крупскага, Шклоўскага, Горацкага.

8. У Полацку—25 верасьня з удзелам раёнаў: Полацкага, Дрысенскага, Асьвейскага, Расонскага і Вушацкага.

На нараду павінны зьявіцца рэдактары райгазэт, агітмасы райкомаў і па адным рэдактары нізавой калгаснай газэты кожнага раёну (аб асобных выступленьнях па колькасьці прадстаўнікоў райкомы будуць паведамлены асобна).

На нарадзе будуць заслуханы інфармацыі рэдактароў газэт і агітмасаў па пытаньнях мабілізацыі мас навакол выкананьня плянаў збожжазагатовак.

Нарады праводзяцца за рахунак міжраённых кантор Загатзбожжа, за выключэньнем выдаткаў на праезд рэдактароў райгазэт.

Культпроп ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.
Агітмас ЛЕНЦНЭР.

Рабочы канвэеру піша..

ЛЯГЕНДА АБ ГЕНРЫ ФОРДЗЕ

(Ліст амэрыканскага рабочага)

Генры Форд зноў абвешчан нацыянальным героем: ён выпусьціў ізьве новых мадэлі аўтамабіля. Вялікі прамыслоўца цьвердзіць, што на гэты раз ён далёкі ад мысьлі аб барышах, і што ў гэтай справе ён кіраваўся адзінай мэтай—даць работу тысячам беспрацоўных. Гэтым шляхам Генры Форд хоча стварыць сабе роль дабрачынцы ў грамадзкай думцы амэрыканцаў, але яго рабочыя думаюць інакш... і маюць рацыю.

„Высокая аплата“

Калі яго заводы перайшлі на пяцідзённы тыдзень, Форд шырока агаласіў, што **калі рабочыя ў пяцідзённы тыдзень будуць даваць 6-дзённую норму працы,** дык ён будзе выплачваць поўную тыднёвую зарплату. Хутка работа дасягнула пажаданага ўзроўню, але большасьць рабочых не атрымала ні малейшай прыбаўкі. Наадварот, у галоўных цэхах Форда на Рывэр-Руж праведзена далейшае скарачэньне зарплаты.

Калі ў 1929 годзе заводы Форда былі зноў адкрыты для выпуску мадэлі «А», тысячы рабочых, якія працавалі па некалькі год і зарабілі раней па 8-10 даляраў у дзень, былі зволены, каб праз некаторы час быць прынятымі ў **якасьці навічкоў з аплатай у 5 даляраў.** Старыя рабочыя часта звальняюцца, каб даць месца маладым, якія менш аплачваюцца. На саміх заводах рабочыя часта перакідваюцца з цэху ў цэх, са скарачэньнем кожны раз зарплаты.

Шпаркасьць, перш за ўсё

Галоўным чынам рабочыя скарджацца на галавакружыцельныя тэмпы работы канвэеру. Яны ня могуць слова вымавіць, ні перадыхнуць, апрача 20-мінутнага перапынку ў 12 гадз. дня. Яны ня могуць адлучыцца ў прыбіральню, нават пакінуўшы каго небудзь замест сябе. «Вядомае» павялічэньне зарплаты ў 1929 г. было ў сапраўднасьці пакрыта павялічэньнем тэмпаў, у работе. З гэтага часу тэмпы ўсё нарастаюць.

Для прыкладу: мэханік, які некалькі год таму назад наглядаў за 4 машынамі, зараз абавязан наглядаць **за 9 і нават за 12 машынамі.** Рэзультатам гэтага нязвычайнага паскарэньня тэмпаў зьявілася значнае павялічэньне няшчасных выпадкаў. Гэты адваротны бок мэдалі зусім невядомы грамадзкасьці, бо Форд мае ўласныя больніцы ў Дэтройце, у якіх работа таксама праводзіцца па канвэеру — не пасмее яшчэ ачуняць адзін, як яго выпісваюць і кладуць другога. Прэса гэтага гораду зусім нічога ня піша аб гэтых выпадках.

У дзень майго паступленьня на службу— піша рабочы **Элен,** — загінула 6 рабочых ад няшчаснага выпадку на электрастанцыі. Паводле думкі рабочых, на заводах Рывэ-Ружа штодзённа ў сярэднім гіне адзін чалавек. Шалёныя тэмпы перашкаджаюць застасоўваць неабходныя меры перасьцярогі, прыпісаныя «аддзелам бясьпекі». Нядаўна аддзел бясьпекі прапанаваў начальніку цэху паставіць агароджы да некаторых машын, ля якіх адбыліся няшчасныя выпадкі. Праз некалькі тыдняў адміністрацыя павінна была адмовіцца ад гэтага папераджальнага мерапрыемства, бо яно замаруджвала тэмпы работы.

Прыдзірчывыя і бесчалавечныя адносіны ставяць рабочых у пецярпімае становішча. Даволі затрымацца ў прыбіральні некалькі мінут больш, чым гэта дазваляецца правіламі, і **рабочы звальняецца бяз лішніх фармальнасьцяй.** Калі вас убачаць у калідоры з кавалкам хлеба ў роце, то будзьце ўпэўнены, што вы зараз-жа будзеце звольнены. Калі вы на мінуту спазьніліся, каб здаць інструмэнты, або вас падарозе затрымаў таварыш, каб абмяняцца з вамі нараю слоў — **чакайце тых-жа рэзультатаў — вы зараз-жа звальняецеся.**

«Аддзел нагляду» займаецца «зьнішчэньнем нездавальненьня» рабочых. Работнікі гэтага аддзелу, пераважна былыя прафесыянальныя баксёры, знаёмыя ў мінулым вельмі часта з лавай падсудных. Сакрэтны аддзел працуе патаемна. Супрацоўнікі гэтага аддзелу разьмеркаваны па ўсіх цэхах і яны нічым з вонкавага выгляду не адрозьніваюцца ад звычайных рабочых.. Іх задача заключаецца ў тым, каб наглядаць за тымі, хто пашырае «пагубныя» ідэі. **Малейшая крытыка супроць Форда цягне за сабою неадкладнае звальненьне.**

Вось у якіх умовах працуе амэрыканскі рабочы на прадпрыемствах славутага аўтамабільнага «караля» Генры Форда.

Робэрт Элен.

„99 проц. прапаганды за мір пабудована на балбатні“

Лёйд Джордж—за роўнапраўе ўзбраеньня для Германіі

БЭРЛІН, 18. (ТАСС). «Бэрлінэр Бэрзэн Кур'ер» публікуе артыкул **Лёйд Джорджа** пад загалоўкам **«Роўнапраўе для Германіі»,** у якім між іншым гаворыцца: «Клемансо і Вільсон памерлі, засталіся жывымі Дзюландо і я. Як адзін з тых, што засталіся жывымі, я не саромлюся салідарызавацца з германскім пунктам гледжаньня, які зводзіцца да таго, што дзяржавы-пераможцы ганебна не апраўдалі давер'я да іх у пытаньні ўзбраеньня. Дзяржаўныя дзеячы Германіі праяўлялі на працягу ўсіх мінулых 13 год высокую ступень цярпліваасьці, уступлівасьці і стрыманасьці. Простае пералічэньне элементарных фактаў, — піша далей Лёйд Джордж,—якія ілюструюць стан эўрапэйскага ўзбраеньня, вядзе да поўнага апраўданьня германскай пазыцыі. Лічбы, якія я зараз падаю, яшчэ ня былі агалошаны, але, ня гледзячы на гэта, яны правільныя, бо выцякаюць з сур'ёзнай крыніцы. Прычына таго, што гэтыя лічбы дагэтуль не публікаваліся тая, што ўся **прапаганда за мір на 99 проц. пабудавана на балбатні.** Пацыфісты ня лічаць патрэбным пільнаваць важнейшых фактаў.

«Францыя,—указвае далей Лёйд Джордж,— мае кадравую армію мірнага часу ў складзе **звыш 500 тыс. чалавек.** Падрыхтаваныя рэзэрвы, якія могуць быць закліканы на службу ў ваенны час, **складаюць прыблізна 5 млн. чалавек.** Узбраеньня для гэтых мільёнаў ёсьць даволі: **у францускіх арсэналах дзесяткі тысяч кулямётаў, тысячы лёгкіх гармат і,** што яшчэ важней, **шмат тысяч сярэдніх і цяжкіх гарматаў, а таксама сотні танкаў.**

У Італіі 3 з паловай мільёнаў ваенна-навучаных рэзэрваў, тысячы гарматаў розных калібраў.

Чэха-Славакія з насельніцтвам у 14,7 млн. чалавек мае кадравую армію мірнага часу ў **135 тыс. ч.** Рэзэрвы і навучаныя сілы дасягаюць **850 тыс. чал.,** Чэха-Славакія мае **звыш 3.500 кулямётаў, 840 лёгкіх гармат, 335 гармат сярэдніх калібраў, у тым ліку мае 6-ціцалёвыя пушкі і гаўбіцы, а таксама цяжкія гарматы і магутныя танкавыя злучэньні.**

У той-жа час германская рэспубліка паводле вэрсальскага дагавору мае права ўтрымліваць армію ў 100 тыс. чалавек без цяжкіх навучаных і ўзброеных рэзэрваў. «Сталёвы шлем», «карычневая» армія могуць быць за найлепшы салдацкі матар'ял у тым выпадку, калі яны будуць мець кулямёты і гарматы.

Польская армія мірнага часу — **240 тыс. чалавек,** тады як рэзэрвы і навучаныя кадры, што ёсьць у распараджэньні на выпадак вайны, даходзяць да **1.874 тыс. чал.** Польшча мае **10.400 кулямётаў, 1.515 рухомых лёгкіх гармат, 360 цяжкіх гармат і 70 танкаў».**

У заключэньне Лёйд Джорж піша: «Францускія грошы дазваляюць гэтым дробным дзяржавам забясьпечваць свае арміі магутным узбраеньнем. Француская палітыка заключаецца ў тым, каб акружыць Германію сьцяной вострых штыхоў».

Вучастак за[illegible] павінна зірнуць пракуратура

Працягваецца злачынная нядбайнасьць пры адгрузцы гароднины

«Зьвязда» пядаўна адзначала недапушчальнае становішча з адгрузкай гароднины. Быў прыведзен рад прыкладаў злачыннай адпраўкі гароднины, што пакіроўвалася для снабжэньня рабочых Ленінграду.

Зараз мы можам прывесьці новыя прыклады злачыннай нядбайнасьці ў адгрузцы гароднины для патрэб пралетарскіх цэнтраў БССР. Агіднасьці працягваюцца. Былі выпадкі, калі плодагародніна прыходзіла на месца прызначэньня з бракам-адкідам да 90—100 проц. Прычыны браку аднолькавыя: грузілася не перабраная, перасьпеўшая, памятая, заражоная хваробамі гароднина разам з добрай укладвалася ў скрыні і мяшкі. Прадукцыю грузілі ў неадпаведную буйную тару: гуркі ў 5-6 пудовыя мяшкі, памідоры — у яблычныя скрыні 32 кгр., сьпелыя сьлівы — у 15 пуд. скрыні.

Прывядзем рад яркіх прыкладаў, якія сьцьвярджаюць гэта.

Са станцыі **Градзянка** 7 верасьня прыбыў у Менск вагон са сьлівамі, якія пасаваліся на 90 проц. Прыбывала таксама маладая дробная бульба з прымесьсю пашкоджанай гнілой, зьмешаная з зямлёю больш чым на 20 проц.

Асіпавіцкі райзагаслаў у Менск са станцыі **Асіпавічы** вагон, гружаны гуркамі. У ім было добраякасных гуркоў 55 проц., мятых — 3 проц., бітых — 2 проц., пролых — 40 проц. Вагон быў шчыльна зачынены, гуркі былі загружаны ў вялікіх палатняных мяхох, шчыльна завязаны і навалены бяз усякай сыстэмы і парадку.

21 жніўня прыбыў са станцыі Жлобін у Менск вагон з гуркамі, з якіх добраякасных аказалася 20 проц., гнілых — 40 проц., мятых і бітых — 25 проц., перасьпелых — 15 проц. Пагрузка ішла навалам, сартаваньня ня было. Вагон быў у дарозе двое сутак.

21-га жніўня ў Менск прыбыло каля 9 тысяч кгр. сьпелых памідораў і гуркоў. Пры праверцы аказалася: добраякасных — 20 проц., гнілых — 24 проц., поўбраку — 32 проц. Прычына — неадпаведная тара і адсутнасьць сартаваньня.

У канцы жніўня ў Менск са станцыі Слуцак прыбыў вагон з яблыкамі, з якіх толькі палова прызнана добраякаснымі. Яблыкі былі не сартаваныя, паражоныя рознымі хваробамі.

У канцы-ж жніўня ў вагоне з гуркамі, адпраўленымі ў Менск са станцыі Койданава, з 10.300 кгр. было добраякасных толькі 40 проц. Вагон быў перагружаны, сартоўка не праводзілася. Са станцыі «Чырвоны берег» прыбыў вагон № 132823 з гуркамі і памідорамі, нагружанымі навалам і ў скрынях. Добраякасных аказалася толькі 55 проц.

6 верасьня са станцыі Брожа ў Менск былі адпраўлены мясцовым сельспажытаварыствам два вагоны са сьвежай бульбай, з якой добраякаснай было ня больш 38 процантаў. Бульба была не перабрана і зьмешана з зямлёй.

7 верасьня ў Менск прыбыў вагон № 517585 з журавінамі, сьлівамі і яблыкамі. Сьлівы пасаваліся на 90 проц., бо яны былі складзены ў вялікія 15-ці пудовыя скрыні.

Як назваць такія адносіны да адгрузкі? Колькі тысяч дзяржаўных грошай марна загінулі з-за злачыннай нядбайнасьці загатоўчых арганізацый? Гэта сапраўднае шкодніцтва, якое павінна быць пакарана.

Загатоўчыя арганізацыі ў сваіх зводках і справаздачах, у сваіх тэлеграмах аб адгрузках урачыста даносяць аб выкананьні плянаў. Раз колькасныя паказальнікі выкананы, застаецца толькі прэміяваць загатоўцаў. Што-ж дае рабочаму спажыўцу такая работа? Апрача дарэмнай траты грошай і лішняга прабегу вагонаў — нічога!

Зараз пастаў сэзон зімовых загатовак, калі трэба загатаўляць бульбу і плодагародніну, прызначаную да доўгага хаваньня для забясьпячэньня рабочага спажыўца на цэлы год. Зразумела, што бульба і плодагародніна можа доўга захоўвацца толькі тады, калі яна будзе добраякаснай, добра перабранай, рассартаванай па гатунках. Таму самая сур'ёзная ўвага павінна быць аддана правільнаму выкананьню правіл адгрузкі.

Неабходна забясьпечыць месца адгрузак — чыгуначныя станцыі пунктамі прыёмкі — памяшканьнямі, прыстасаванымі для загатовак прадукцыі, абсталяваць на станцыях і прыстанях часовыя навесі.

Трэба забясьпечыць адгрузачныя і прыёмачныя пункты кваліфікаванымі прыёмшчыкамі, добра інструктаванымі, якія могуць правільна ажыцьцяўляць правілы адгрузкі. Чыгуначныя пункты павінны мець лесаматар'ялы для абсталяваньня вагонаў: (дошкі, абапалы, жэрдзі), матар'ялы для ўцяпляньня вагонаў у выпадку пахаладаньня. Загатоўчым арганізацыям неабходна ўзмацніць інструктаж у калгасах, саўгасах, сярод аднаасобнікаў аб парадку сартаваньня загатоўленай прадукцыі, аб пераборцы яе на месцы.

Тая прадукцыя, якая будзе прывезена на прыёмачны пункт, павінна быць адсартавана з тым, каб ня было патружана ў вагон ні аднаго кілё нягоднай гароднины, або прымесі.

Чыгуначныя арганізацыі не павінны прымаць грузаў без сэртыфікату інспэкцыі, або без даведкі аб якасьці зданай прадукцыі.

Рабочай грамадзкасьці трэба ўзяць пад кантроль работу па загатоўках і адгрузцы гароднины.

Лёзунг: «Ні аднаго кілёграма папсаванай плодагароднай прадукцыі» павінен быць ажыцьцёўлены ва што бы там ні стала.

Васільлоў.

Паведамленьне

— ПК ЦКК КП(б)Б выклікае на 28 верасьня г. г., у 10 гадз. раніцы (Менск, Савецкая, 55), наступных таварышоў на пасяджэньне, дзе будуць разглядацца партсправы: Анціпенка С. А., Янкулевіча Я. К., Бранштэйна М. Г., Шастакова П. П., Баканова К. І., Апанасенка М. К., Турэўца Р. С., Бутрова А., Губарэва Ф. П. (Жлобінскі раён), Капавальчыка К. Т. (Жлобінскі раён), Тарасава (б. пракуратура, Плешчаніцкага р-ну), Афанасьева С. У. Жукаўца Е. К., Загарольскага Н. Д., Ханеўскага С. Н., Хандруткова А. К., Кандрацьева Ф. Ф., Путаўца В. А. Яўка выкліканых абавязкова. Просьба да парт. арганізацый на вучоце якіх лічацца памянёныя таварышы, шырока апавясьціць аб яўцы іх на пасяджэньне ПК ЦКК. Выкліканыя таварышы павінны прадставіць у ПК ЦКК КП(б)Б водзывы ад парт. ячэек аб апошняй сваёй рабоце. Праезд не аплачваецца.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

22 верасьня г.г., у 2 гадз. дня, у Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР (пр. Леніна, 1 Універсытэцкай, 3-ці паверх, пакой № 39) акадэмікам І. І. Замоцінымі — будзе прачытан даклад: —

„Творчы шлях М. ГОРКАГА“

(да 40-годзьдзя літарат. дзейнасьці)

Запрашаюцца вылучаныя грамадзкімі арганізацыямі дакладчыкі да юбілею М. Горкага, пісьменьнікі, настаўніцтва, студэнты. Уваход вольны.

Дырэкцыя Ін-ту ЛІМ.

„Чырвоная Зорка“. Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса — ад 4 г. — КУЛЬГАВЫ ПАН. Звыш праграмы кіно-хроніка САЮЗКІНО.

„Інтэрнацыянал“. Пач.: 6 г., 7 30, 9, 10-30. Дзенны сэанс у 2 гадзіны. — СУПРАЦІЎНІЦЫ. драма ў 6 частках. Кіно-хроніка САЮЗКІНО.

„Пралетары“ — 3-я апошняя сарыя фільму „Чырвоныя д'абалята“ „САВУР МАГІЛА“. Дзенныя дзіцячыя сэансы ДЗЕЦІ ШАХЦЁРА. Пачатак в 2 г. дня.

„СПАРТАК“ Пач.: 7, 8-15, 9-30, 10-45. Каса—з 5 г. — ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ САКРЭТ ХАРАСТВА камэдыя ў 6 ч. У гал. ролі Рычард Толмэдж

БРАГІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІКУМ

буйнай сацыялістычнай мывёлагадоўлі і малочнай прамысловасьці

прапягвае прыём заяў да 25-га верасьня 1932 г.

На першы курс тэхнікуму прымаюцца асобы з адукацыяй за сямігодку, на другі—за 8—9 груп. Асобы, якія ня маюць пасьведчаньня аб адукацыі, могуць трымаць іспыты.

Прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры ад 40 да 110 р. і сталоўкай.

Тэхнікум рыхтуе зоатэхнікаў па буйной мывёлагадоўлі і тэхналёгаў па малочнай справе.

Дакуманты накіроўваць па адрасе: БССР, м. Брагін, тэхнікуму.

Дырэктар тэхнікуму Валодзька.

Мсьціслаўскі вучотна-фінансавы тэхнікум Калгасцэнтру БССР

працягвае прыём заяў на 1-шы курс тэхнікуму.

Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў для раённага зьвяна калгасгістэмы ў галіне: вучоту, плянаваньня, фінанс. і крэдыту. Тэрмін навучаньня 3 гады. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй па нормах ураду. Узрост паступаючых ад 17 да 35 год. Асобы, якія скончылі 7-годкі, ШКМ, фЗС, курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум, а таксама тыя, што скончылі 6 груп гэтых школ, але маюць стаж фін.-вучотн. працы на менш 5 месяцаў, прымаюцца бяз іспытаў. Усе іншыя падлягаюць іспытам у аб'ёме 7-годкі.

Да заяў аб паступленьні падаць наступныя дакументы (у арыгіналах): аб узросьце, аб адукацыі, аб сацпахождэньні і матар'яльн. становішчы пасупаючага і яго бацькоў, вучотна-вайсковы білет (для мужчын), анкету, асьведчаную сав., парт., праф. або іншы арганізац. аб стане здароўя, 2 фотакарткі.

Заявы і дакументы з далучэньнем на 30 кап. пашт. марак (не пазьней 30 верасьня) накіраваць па адрасе: г. Мсьціслаў, Савецкая 11-9, вучотна-фін. тэхнікум.

Да атрыманьня паведамленьня ад тэхнікуму аб залічэньні і пачатку занятняў на вучобу не выяжджаць.

Дырэктар тэхнікуму Жыгуноў.

ПРАВІЛЫ

прыёму на 6-цімесячныя курсы прапагандыстаў пры Ўсебеларускім Доме Партасьветы (Прылукі).

1) КУРСЫ прапагандыстаў ставяць сваёй мэтай падрыхтоўку прапагандыстаў-арганізатараў партасьветы для райкомаў КП(б)Б, ЛКСМБ і партарганізацый буйных прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў.

2) На курсы прапагандыстаў прымаюцца т. т., адказваючыя наступным запатрабаваньням:

а) Член партыі з 2-хгадовым партстажам.

УВАГА: На камсамольскае аддзяленьне прымаюцца члены КСМ са стажам 3 год. Перавага даецца членам і кандыдатам КП(б)Б.

б) Паступаючыя на курсы павінны мець падрыхтоўку: агульна-адукацыйную ў аб'ёме школы І ступені, грампалітычную—у аб'ёме ВОПШ.

в) На курсы прымаюцца ў першую чаргу т. т., маючыя вопыт прафработы. Перавага даецца рабоч